УСЕ НА СВЯТА «БЕЛАРУСЬ — АДКРЫТАЯ КНІГА» 3

МІНШЧЫНА: НОВАЕ Ў РЭГІСТРАЦЫІ ТРАНСПАРТУ 4




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родным мове

# ЗВЯЗДА

24 СТУДЗЕНЯ 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 15 (29129)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**ІГАР ПЕТРЫШЭНКА, НАМЕСНІК ПРЭМ'ЕР-МІНІСТРА:**

*«Чакаецца, што да 2050 года ў 64 краінах доля людзей старэйшага ўзросту складзе больш за 30 % насельніцтва. Гэта сур'ёзны выклік, які можа мець значныя наступствы для ўстойлівага развіцця грамадства. Старэнне насельніцтва негатыўна адбіваецца на рынку працы, стабільнасці пенсійнай сістэмы. Пастаўленыя кіраўніком дзяржавы задачы па ўмацаванні дэмаграфічнай бяспекі патрабуюць ад нас дэталёвага разгляду ўсіх аспектаў дэмаграфічнага развіцця, прыняцця выверанных рашэнняў па кожным напрамку. Важна не толькі ўсвядоміць маштабнасць працэсу старэння, ацаніць яго ўплыў на эканоміку, але і ўбачыць патэнцыял людзей сталага ўзросту, вызначыць шляхі яго магчымага прымянення».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Навука карыстаецца асаблівай падтрымкай і даверам з боку дзяржавы»

## Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўручыў дыпломы дактароў навук і атэстаты прафесараў 18 навукоўцам

**Іх матывуюць на здзяйсненні выклікі сучаснасці і хваробы, натхняюць нявырашаныя загадкі прыроды і мудрагелістыя законы жыцця, ім даюць натхненне новая эканамічная і грамадская рэчаіснасць. Дзякуючы іх інтуіцыі, ведам, самаахвярнасці і працы краіна атрымлівае шанцы заняць пачэснае месца на вяршынях міжнароднага навуковага Алімпа.**

### Выпадковыя адкрыцці невыпадковых людзей

Па словах Прэзідэнта, у Беларусі навука карыстаецца асаблівай падтрымкай і даверам з боку дзяржавы, і патрабаванні вельмі сур'ёзныя. Ён упэўнены, што вучоным у Беларусі стаць няпроста, атрымаць званне, абараніць кандыдацкую ці доктарскую дысертацыю з кожным годам становіцца складаней.

Высокі інтэлект нацыі і жыватворная крыніца культурных традыцый, як адзначыў падчас выступлення на цырымоніі Аляксандр Лукашэнка, — дзве галоўныя сілы, якія жывяць моц нашай дзяржавы.

СТАР. 2



Фота БелТА.

Дыплом доктара навук з рук Прэзідэнта атрымлівае шматгадовая супрацоўніца «Звязды» Таццяна Падаляк.

# На сядзібе канікул не бывае



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Гаспадар аграсядзібы «Поўсвіж», якая знаходзіцца ў Лепельскім раёне, Васіль ШКІНДЗЕР, зімнімі днямі, калі турыстаў не вельмі шмат, любіць займацца цяслярска-сталярнай працай, разьбярствам. Мэблю для гасцявых домікаў — сталы, крэслы, лаўкі і іздзлікі — ён робіць сваімі рукамі, звычайным дзедаўскім рыштункам. Часта ў гэтай справе яму дапамагаюць умелыя і працавітыя суседзі-вяскоўцы.

## КОРАТКА

- Чаканая сярэдняя працягласць жыцця ў Беларусі да 2030 года павінна скласці 80 гадоў.
- **Новы рэзідэнт СЭЗ «Мінск» пабудуе ў Фаніпалі завод па вытворчасці спецтэхнікі, якая прызначана для земляных, будаўнічых і транспарціровачных работ.**
- Праект пастановы аб узнагародзе за камерцыйнае выкарыстанне фанаграм вынесены на абмеркаванне.
- **У Беларусі стартуе другі сезон праекта «Жаночая справа».**
- Інвестар з Конга створыць у Віцебскай вобласці вытворчасць запалкавай саломкі.
- **У Баранавіцкім радзільным доме абнавілі абсталяванне для рэанімацыі нованароджаных.**

Па палічках

# Ці прыбавяць адходы расходаў?

## Як адаб'юцца на насельніцтве і бізнесе змены ў заканадаўства ў сферы абыходжання з адходамі

**Толькі за першы месяц года ў краіне было прынята тры дакументы, якія рэгулююць сферу абыходжання з адходамі. Якія змены яны нясуць? Разбіраемся са спецыялістамі.**

### АДКАЗНАСЦЬ ЗА СМЕЦЦЕ

З 2012 года ў нашай краіне дзейнічае прынцып пашыранай адказнасці вытворцаў. Згодна з ім, вытворцы ці імпарцёры нясуць адказнасць за абыходжанне са сваімі таварамі і ўпакоўкай, калі тыя страцяць спажывецкія якасці і пяройдуць у катэгорыю адходаў.

— У сусветнай практыцы ёсць некалькі спосабаў выканання гэтага абавязку, аналагічныя прадугледжаны і ў Беларусі: вытворцы і пастаўшчыкі ствараюць уласную сістэму збору адходаў тавараў і ўпакоўкі ці фінансуюць агульную сістэму збору, — тлумачыць **начальнік упраўлення па каардынацыі дзейнасці ў сферы абыходжання з другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі ДУ «Апаратар другасных матэрыяльных рэсурсаў» Анатоль ШАГУН.** — Усё гэта прапісана ва Указе № 313 «Аб некаторых пытаннях абыходжання з адходамі спажывання», прынятым у 2012 годзе.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X
20015>

# «Навука карыстаецца асаблівай падтрымкай і даверам з боку дзяржавы»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ушанаванне ў Палацы Незалежнасці напярэдадні Дня беларускай навукі яе найлепшых прадстаўнікоў — гэта адзнака стратэгічнай значнасці найважнейшай для развіцця краіны галіны.

«У гэтым годзе сваё прафесійнае свята вы сустрэнеце ўжо ў новым статусе. Прысваенне званняў доктара навук і прафесара стане чарговай вашай перамогай на найскладанейшым шляху пазнання законаў прыроды, грамадства, а таксама асновай для вашых новых здзяйсненняў і не толькі вашых. Многія адкрыцці ў навуцы робяцца выпадкова, але дакладна не выпадковымі людзьмі», — сказаў кіраўнік краіны.

Прэзідэнт падкрэсліў, што за кожным вынікам стаяць гады самааддданай, напружанай працы, а самая цяжкая праца чалавецтва — праца вучонага. Навуковую ісціну спасцігаюць толькі самыя таленавітыя, настойлівыя і мэтанакіраваныя.

Айчынныя навукоўцы актыўна ўцягнуты ў многія грамадска-палітычныя працэсы жыцця краіны. І гэтая высокая місія патрабуе ад кожнага з іх вялікай самааддачы і адказнасці за рашэнні, што прымаюцца.

***Атрымаць званне і прызнанне з году ў год становіцца цяжэй. «Па крайняй меры за грошы, як гэта было шмат гадоў таму (я закрануў гэтыя часы), наўрад ці гэта магчыма»,*** — канстатаваў Прэзідэнт.

Кіраўнік краіны звярнуў увагу, што ***сёння як ніколі жыццёва важна ўвайсці і замацавацца ў групе краін-распрацоўшчыкаў і вытворцаў высокатэхналагічнай і навукаёмістай прадукцыі.***

***«У нас ёсць усе падставы для паспяховага руху ў дадзеным кірунку.*** Беларусь ужо здабыла шырокую вядомасць дзякуючы даследаванням і распрацоўкам у галіне інфармацыйных і касмічных тэхналогій, атамнай энергетыкі, фізікі, машынабудавання, аграпрамысловасці і біятэхналогій, медыцыны і фармацэўтыкі, — упэўнены Аляксандр Лукашэнка. — На вашых плячах, як бы пафасна гэта ні гучала, — адказнасць за будучыню нашых дзяцей».

Дасягненні гэтага пакалення вучоных абавязкова павінны знайсці развіццё ў выніках працы найлепшых вучняў — перспектыўных, амбіцыйных, з дзяржаўным мысленнем. Іх будучы поспех стане сапраўдным пацвярджэннем высокіх званняў і навуковага аўтарытэту настаўніка, а традыцыя пераемнасці інтэлектуальнага патэнцыялу паслужыць галоўным мэтам далейшага развіцця нашай дзяржавы.

## Працуючы надалей, не забываць пра сёння

Пасля цырымоніі ўзнагароджання Аляксандр Лукашэнка запрасіў навукоўцаў да размовы. Ён яшчэ раз падкрэсліў, што з вялікай павагай ставіцца да вучоных і падзяліўся, што ў свой час адмовіўся займацца навукай.

Першым з дакладам аб дзейнасці Вышэйшай атэстацыйнай камісіі выступіў яе **старшыня Аляксандр ГУЧОК.** У найбліжэйшы час увага ўстановы будзе накіравана на павышэнне адкрытасці працэдур публічнай абароны дысертацый (вопыт у трансляцыі анлайн гэтага працэсу ўжо ёсць).

Дыскусію выклікала працэдура апеляцыі па адхіленых дысертацыях. Прэзідыум ВАК адхіляе



Фота БелТА.

работу па рэкамендацыі экспертнага савета, але і апеляцыі падаюцца ў той жа ВАК, які павінен арганізаваць яе незалежны разгляд.

Прэзідэнт прапанаваў разглядзець скаргі ў якімсьці іншым органе. «Можа, задзейнічаць Акадэмію навук, каб апеляцыя была апеляцыяй. Каб я не звяртаўся да таго (як я сказаў), хто ўжо паставіў кляймо на маёй дысертацыі», — падагульніў кіраўнік дзяржавы і даручыў узяць пад кантроль: «Паглядзіце з Акадэміяй навук, урадам, кіраўніцтвам ВАК. Без усякіх асабістых падыходаў. Шчыра кажучы — дакладзіце. ***Не, дык не — пакінем гэту сістэму. Калі вы палічыце неабходным, што павінна быць некалькі іншая сістэма (жыццё развіваецца, на гэтым узроўні мы засвоілі ўсё, што планавалі, рухацца трэба кудысьці наперад), разгледзім давайце гэта пытанне».***

Жорсткае патрабаванне, якое не патрабуе перагляду, — практыка-арыентаванасць работ, магчымасць прымяніць іх у жыцці.

***«Трэба, каб мы ў сваіх разважаннях, стратэгічным апісанні, сыходзячы далёка, не забыліся пра тое, што нам трэба кожны дзень.***

Зайшла размова і зноў пра адукацыю — праграмы, падручнікі, працоўны час настаўнікаў. «Здаецца навукоўцы нешта там вынайшлі, зразумелі, чаму навучаць, як вучыць, а калі пачынаем падыходзіць туды, дзе гэта павінна працаваць, — бяда, — засяродзіў увагу Прэзідэнт. — ***Праблема, чаму вучыць і як, застаецца.*** Мы ў гэтым годзе вернемся да гэтага пытання. Нам трэба паглядзець, чаму навучаць, праграмы пад гэта зрабіць. Не на чатыры-пяць-сем гадоў — а скарацць, дзе гэта можна, аж да таго, каб павыкідалі тэмы».

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў праз пэўны час далажыць, як рэалізуюцца яго даручэнні, дадзеныя Акадэміі навук некалькі год таму.

## Унікальныя аперацыі і адаптацыя да клімату

Падчас сустрэчы пра сутнасць сваёй распрацоўкі расказала Прэзідэнту **Вольга МАТЫЛЕВІЧ, доктар медыцынскіх навук, вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі анкагенікалогіі «РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава».** Па яе словах, у краіне ўкаранены органазахавальныя аперацыі пры раку шыйкі маткі, а раней навукоўцы не маглі нават уявіць, што орган, пашкоджаны пухлінай, можа быць захаваны. «Намі распрацаваны алгарытм адбору такіх пацыентаў і выкананы такія аперацыі. Яны штучныя, яны ўнікальныя, яны высокатэхналагічныя, калі выдаляецца пухліна, а орган захоўваецца для далейшага дзетанараджэння», — паведаміла навуковец.

**Доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, дырэктар «Інстытута прыродакарыстання НАН Беларусі» Сяргей ЛЫСЕНКА** займаецца праблемамі змянення клімату. Калі мы не можам на надвор'е паўплываць, павінны адаптавацца. Навукоўцы правялі рэгіянальную адаптацыю глабальных кліматычных мадэляў і распрацавалі сцэнарый змянення клімату ў Беларусі ў бягучым стагоддзі. Гэтыя і іншыя звесткі дапамаглі стварыць стратэгію па адаптацыі сельскай гаспадаркі.

**Аксана ПРЫБУШЭНЯ, доктар медыцынскіх навук, дацэнт, загадчык лабараторыі медыцынскай генетыкі і маніторынгу прыроджаных парокаў развіцця «РНПЦ «Маці і дзіця»,** прадставіла кіраўніку краіны сваю работу. Яна прысвечана шматплоднай цяжарнасці, дыягностыцы спадчынных прыроджаных захворванняў і зніжэнню акушэрскіх ускладненняў пры шматплоддзі.

Сярод прысутных на сустрэчы з Прэзідэнтам была і шматгадовы аўтар «Звязды», **доктар філалагічных навук, дацэнт кафедры медыялогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Тацццяна ПАДАЛЯК.** Яе работа прысвечана каштоўнасцям сучаснай беларускай журналістыкі. Асаблівая ўвага надаецца праблемам фальсіфікацыі Другой сусветнай вайны.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### Каментарый у тэму

«Колькасць прысуджаных вучоных ступеняў доктара і кандыдата навук паменшылася больш чым на 25 працэнтаў. Падыходы засталіся былымі, калі казаць пра патрабаванне няўхільнага захавання заканадаўства, якое рэгламентуе атэстацыйную дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь. ВАК стаў значна больш увагі ўдзяляць вывучэнню зместу дысертацый, кантролю за працай экспертаў на розных этапах, — паведаміў журналістам старшыня Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Аляксандр Гучок. — Практыка-арыентаванасць у работах — гэта асноўнае патрабаванне экспертаў на самых ранніх этапах. І гэта патрабаванне адсочваецца і ў экспертных саветах, і ў Прэзідыуме ВАК самым дасканалым чынам. Мы патрабуем пацвярджэння ад устаноў, арганізацый, прадпрыемстваў, міністэрстваў, ведамстваў, дзе выніку той ці іншай навуковай работы рэальна ўкаранёны».

«На працягу двух дзесяцігоддзяў я працавала ў газеце «Звязда». Гэта сапраўды вялікая школа — праца ў такой найстарэйшай беларускай газеце. Я маю гонар сказаць, што працягнула традыцыі патрыятычнай газеты «Звязда», якая выдавалася ў падполлі, у партызанскай зоне. І асабліва хацелася б мне сказаць пра маіх настаўнікаў-журналістаў. Гэта былі рэдактар газеты Уладзімір Браніслававіч Нарკевіч, намеснікі галоўнага рэдактара — Уладзімір Васілевіч Міхаевіч, Людміла Іванаўна Рыжанкова. І ўсім маім калегам удзячна. Маю шчасце і ўдзячнасць, што час ад часу мае нарысы газета «Звязда» друкуе», — расказала карэспандэнту «Звязды» Тацццяна Падаляк.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Генеральны сакратар ААН абвясціў аб чатырох «вершніках апакаліпсісу»



Чатыры «вершнікі апакаліпсісу», якія ў цяперашні момант найбольш пагражаюць свету, — гэта геапалітычная напружанасць, кліматычныя змены, глабальны недавер да палітычных інстытутаў і злоўжыванне новымі тэхналогіямі. Пра гэта заявіў генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый Антоніу Гутэрыш, выступаючы на Генасамблеі ААН. «Наш свет набліжаецца да кропкі незвароту», — заўважыў генсек. Нягледзячы на гэта, Гутэрыш звярнуў увагу і на «некаторыя прыкметы надзеі». Па яго словах, за апошні год удалося прадухіліць шэраг канфліктаў, у тым ліку ў Дэмакратычнай Рэспубліцы Конга, на Мадагаскары, у Малі, на Мальдыўскіх астравах. Сярод канфліктаў, дзе ўдалося дасягнуць некаторага прагрэсу ва ўрэгуляванні, ён назваў Емен, Сірыю і Лівію.

### Аўтапартрэт задумлівага Ван Гога аказаўся сапраўдны



Карціна напісана познім летам 1889 года ў шпіталі ў Сен-Рэмі-дэ-Праванс. Нацыянальная галерэя ў Осла, якая валодае карцінай, адправіла яе з Нарвегіі ў Нідэрланды на экспертызу. Пры даследаванні выкарыстоўваўся рэнтген і прыцягваліся знаўцы вангогаўскай тэхнікі накладання мазкоў. Былі прааналізаваны лісты мастака да яго брата Тэа. «Гэты аўтапартрэт выклікаў сумненні вельмі доўгі час, — сказаў агенцтву France-Presse старшы спецыяліст музея Ван Гога ў Амстэрдаме Луі ван Цілборг. — У гэтай рабоце, здаецца, усё паказвала на пэндзаль Ван Гога, але ў той жа час некаторыя дэталі адрозніваліся ад іншых яго работ. Нам трэба было знайсці гэтаму тлумачэнне, што было цяжка, але мы, думаецца, разгадалі загадку». Цяпер аўтапартрэт экспануецца ў Амстэрдаме. У Осла карціну вернуць у 2021 годзе — да адкрыцця новага будынка нацыянальнага музея.

## Блізкая ўлада

### ТЭЛЕФАНУЙЦЕ — ВАС ПАЧУЮЦЬ

**Чарговыя прамыя тэлефонныя лініі пройдуць у суботу 25 студзеня ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. На званкі жыхароў краіны з 9.00 да 12.00 будуць адказваць:**

* старшыня БРЭСЦКАГА абласнога Савета дэпутатаў Юрый Іосіфавіч НАРКЕВІЧ. Тэл. 8 016 221 31 21;

* старшыня ВІЦЕБСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

* намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;

кіраўнік спраў ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Ігар Андрэевіч ПАПОЎ. Тэл. 8 015 273 56 44;

* намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Валерый Анатолевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;

* намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

* намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Аляксандр Вікенцевіч ДАРАХОВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.

На слыху

# Шпіталізавана ў асобны бокс

## З падазрэннем на новы каронавірус у бальніцу трапіла мінчанка. Дыягназ не пацвердзіўся

**З падазрэннем на небяспечны каронавірус, які распаўсюджваецца ў Кітаі, шпіталізавана першая беларуска, якая вярнулася з гэтай краіны. Праўда, пасля дыягностыкі высветлілася, што дзяўчына хворая на грып В.**

Як расказала **прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія БАРАДУН,** 22 студзеня ў Мінскую інфекцыйную бальніцу была шпіталізавана 20-гадовая пацыентка са скаргамі на болі ў мышцах, павышэнне тэмпературы да 38,5 градуса і кашаль. Папярэдні дыягназ — вострая рэспіраторная вірусная інфекцыя. Мінчанка расказала, што два дні таму вярнулася з Шанхая. Пацыентку размясцілі ў асобны бокс і ўзялі аналізы на рэспіраторную групу вірусаў.

Учора ў бальніцы прайшоў кансіліум з удзелам галоўнага ўрача Мінскай інфекцыйнай бальніцы Мікалая Юроўскага, намесніка галоўнага ўрача па медыцынскай частцы Святаслава Вельгіна і прафесара, загадчыка кафедры інфекцыйных хвароб БДМУ, доктара медыцынскіх навук Ігара Карпава. Выстаўлены дыягназ, які пасля




**У сталічным аэрапорце ўзмоцнены санітарна-каранцінны кантроль.**

атрымаў лабараторнае пацвярджэнне, — грып В сярэдняй ступені цяжкасці. Праводзіцца лабараторнае даследаванне для выключэння наслаення каронавіруснай інфекцыі.

— Зараз мы атрымалі ўсе рэактывы, якія дазваляюць выявіць менавіта гэты вірус 2019 года — новы штам, які распаўсюджваецца ў КНР, — адзначыў **міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК.**

Яшчэ 31 снежня мінулага года ўлады Кітая інфармавалі Сусветную арганізацыю аховы здароўя аб успышцы невядомай пнеўманіі ў горадзе Ухань. 7 студзеня кітайскія медыкі ўстанавілі ўзбуджальніка хваробы — каронавірус 2019-nCoV. Выпадкі заражэння пнеўманіяй новага тыпу пацверджаны ў 25 правінцыях, аўтаномных раёнах і гарадах цэнтральнага падпарадкавання Кітая. Больш за 5,8 тысячы чалавек мелі цесныя кантакты з хворымі. Сярод іх 4928 знаходзяцца пад медыцынскім назіраннем, астатнім 969 яно не патрэбна. Інкубацыйны перыяд новага вірусу можа складаць каля 14 дзён. Вірус распаўсюджваецца па астатніх краінах: выпадкі заражэння выяўлены ў ЗША, Японіі, Рэспубліцы Карэя, Тайландзе.

Міністэрства аховы здароўя адсочвае сітуацыю з каронавірусам у свеце, узмоцнены прафілактычныя мерапрыемствы па недапушчэнні яго распаўсюджвання ў краіне. Асаблівая ўвага спецыялістаў накіравана на прафілактыку захворвання сярод тых, хто ўязджае ў Беларусь з краін з несприяльнай эпідсітуацыяй. У аэрапортах Беларусі ўзмоцнены санітарна-каранцінны кантроль пасажыраў. У прыватнасці, у Нацыянальным аэрапорце «Мінск» арганізаваны санітарна-каранцінны кантроль пасажыраў, якія прыбываюць з краін, дзе выяўлены выпадкі заражэння, з прымяненнем цеплавізійнага абсталявання.

Спецыялісты РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі пастаянна адсочваюць дынаміку эпідэмічнай сітуацыі ў свеце і гатовы да дыягностыкі ўзбуджальніка захворвання па метадычнай інструкцыі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя.

**Алена КРАВЕЦ.**

# Нафта, газ і космас

## Расія заявіла аб гатоўнасці кампенсаваць шкоду ад бруднай нафты

**Гэтае пытанне абмяркоўвалі ўчора па тэлефоне прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей РУМАС і Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расіі Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ.**

Сярод актуальных пытанняў, якія таксама закранулі ў ходзе размовы, — энергетыка і пашырэнне ўзаемадзеяння з дзяржаўнай карпарацыяй «Роскосмас».

Як паведамляе БелТА, учора Дзмітрый Мезенцаў адзначыў, што расійскі бок гатовы кампенсаваць шкоду ў адпаведнасці з запытам і дакументальна пацверджанымі стратамі, панесенымі беларускімі нафтаперапрацоўчымі прадпрыемствамі. Па яго словах, узгодненыя бакамі падыходы датычацца вызначэння канчатковых памераў будучых выплат.

Па меркаванні пасла Расіі ў Беларусі, нашы краіны ў найбліжэйшы час могуць знайсці аптымальныя рашэнні па нафтагазавых пытаннях.

«Нягледзячы на пэўныя адрозненні ў падыходах бакоў, аптымальныя рашэнні, якія задавольваць партнёраў, павінны быць знойдзены ў найбліжэйшы час, што таксама пацвердзіць маштаб і практыку двухбаковага ўзаемадзеяння па нафце і газе», — сказаў дыпламат.

Напярэдадні

# НАС ЧАКАЕ СВЯТА КНІГІ

**XXVII Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш пройдзе з 5 да 9 лютага на пляцоўках павільёна па праспекце Пераможцаў, 14. Сёлетні слоган выстаўкі — «Беларусь — адкрытая кніга». Плануецца, што яе наведаюць прыкладна 60 тысяч жыхароў і гасцей сталіцы.**

**Намеснік міністра інфармацыі Ігар БУЗОЎСКІ** адзначыў, што работа пляцовак будзе акцэнтавана на тэмах Года малой радзімы, 75-годдзя Вялікай Перамогі, а таксама 90-гадовага юбілею Уладзіміра Караткевіча.

— Удзел у выстаўцы прымуць каля 25 краін блізкага і далёкага замежжа, сярод іх — Германія, Аўстрыя, Азербайджан, Палесціна, Францыя, Турцыя, Узбекістан і іншыя. Ганаровым госцем выступіць Расійская Федэрацыя, цэнтральным экспанентам — ЗША. Чакаецца вялікая колькасць навінак кожны дзень. Галоўная сцэна будзе задзейнічана ў адпаведнасці з тэматычнымі днямі: напрыклад, другі — аўтарскі дзень — плануецца арганізаваць з акцэнтам на творчасць новых сучасных пісьменнікаў. Сярод іх — Ігар Марзалюк, Андрэй Кароль, Вячаслаў Бандарэнка, Аляксандр Данілаў і іншыя. У рамках беларускага дня — праекты, прысвечаныя Году малой радзімы. Пачынаючы з палітычных аспектаў, заканчваючы — кулінарнымі. Адна з навінак гэтага дня — прэзентацыя кнігі Алены Мікульчык, якая раскрывае глыбінныя традыцыі беларускай нацыянальнай кухні.

Ігар Бузоўскі расказаў, што ў дзіцячы дзень плануецца вялікая колькасць паказу кніг для дзяцей і бацькоў. На адной з пляцовак выставачнага цэнтра пройдуць інтэрактыўныя спектаклі. У мэтах прыцягнення маладзёжнай аўдыторыі ў рамках выстаўкі свае работы аўтары прэзентуюць у сацыяльнай сетцы «TikTok». Так госці ўбачаць выстаўку з іншага боку.

— Пляцоўкі будуць працаваць і за межамі самога выставачнага цэнтра. Так, на праспекце Пераможцаў «завядзецца» паэтычны аўтобус, як і ў мінулым годзе, толькі сёлета ён будзе працаваць усе пяць дзён. У сталічных кінатэатрах адбудзецца паказ фільмаў па творах беларускіх аўтараў, у тэатрах — спектаклі.

Свае экспазіцыі прадставяць Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Прэзідэнцкая бібліятэка, Нацыянальная кніжная палата Беларусі, маштабную пляцоўку для сустрэч з аўтарамі зладзіць Саюз пісьменнікаў Беларусі. У дзень закрыцця выстаўкі чакаецца вялікая колькасць разнапланавых прэзентацый, падчас якіх прадставяць кнігі, прымеркаваныя да юбілея ў спецпадраздзяленняў Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, выданні розных краін, што прадстаўляюць Беларусь праз кнігі пра Мірскі замак, Нясвіж, Нясвіжскі замак.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

Надвор'е

# Вышэй за норму, яшчэ і ветрана...

## Да нас на выхадныя прыйдуць франты з Балтыйскага мора

**Калі ўчора яшчэ на большай частцы тэрыторыі нашай краіны з'явілася снежнае покрыва вышынёй да двух сантыметраў, то сёння яно знікне амаль канчаткова. Бо ў пятніцу амаль усюды будуць ісці кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Плюс да ўсяго — тэмпература ўдзень ад нуля да 6 градусаў цяпла. Атмасферны ціск будзе падаць.**

У найбліжэйшыя дні ўмовы надвор'я на тэрыторыі краіны будуць вызначаць атмасферныя франты і цёплыя паветраныя масы атлантычнага паходжання. Чакаецца ветранае з ападкамі і павышаным тэмпературным фонам надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

А вось заўтра ўначы і раніцай на большай частцы тэрыторыі краіны, а ўдзень толькі месцамі пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Дарэчы, усё гэта будзе суправаджацца моцным парывістым ветрам. Уначы на асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны складзе ад мінус 3 да 4 цяпла, удзень — плюс 1—6 градусаў. У нядзелю будзе таксама вільготна. У асобных раёнах (у асноўным на паўночным усходзе краіны) пройдуць невялікія кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Уначы і раніцай месцамі чакаюцца слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да 2 цяпла. Тэмпература паветра ўдзень чакаецца ад нуля да плюс 5 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак уначы ў асобных раёнах не абыдзецца без невялікіх ападкаў, а ўдзень пад уплывам франтальных падзелаў на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдзе невялікі кароткачасовы дождж, месцамі з мокрым снегам. Уначы і раніцай прагназуюцца слабыя туман і галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 градусаў да 2 градусаў вышэй за нуль, удзень будзе ад нуля да 5 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Гандбол

# «Дзясятае месца — гэта наша памылка»

## У заключным матчы асноўнага раўнда мужчынскага чэмпіянату Еўропы — 2020 па гандболе зборная Беларусі згуляла ўнічыю з камандай Аўстрыі — 36:36

**Самым выніковым гульцом сустрэчы стаў беларус Мікіта Вайлупаў, які закінуў 12 мячоў. Падзяліўшы ачкі з аўстрыйцамі, падапечныя Юрыя Шаўцова занялі пятае месца ў групе і 10-е выніковае месца на Еўра-2020. Адзначым, што беларускай зборнай не ўдалося выйсці ў алімпійскі кваліфікацыйны турнір.**



Пасля заключнага матча нашай зборнай галоўны трэнер Юрый Шаўцоў адмовіўся даваць каментарыі, дарэчы, упершыню ў сваёй трэнерскай кар'еры.

«Мы не выканалі пастаўленую мэту, гэта галоўнае расчараванне, — каментуе сустрэчу **лінейны Арцём КАРАЛЁК.** — Мы вельмі моцна хацелі перамагчы і завяршыць турнір на добрай ноце, але не выканалі трэнерскую ўстаноўку. Мы зноў дзясятыя, хоць сталі гуляць лепш. Але дзясятае месца — гэта наша памылка, памылка гульцоў, усіх, хто да гэтага датычны. Усё ідзе ад галавы, гандбол — гэта гульня псіхалогіі. Як ты будзеш падыходзіць да матчаў — так і будзе вынік. Калі хочаш перамагчы, калі верыш у свае сілы — ты гэта зробіш. Трэба быць мацнейшымі менавіта ў маральным плане. Мы допускаем такія страты, якія не паддаюцца тлумачэнням. У матчах з роўнымі сапернікамі мы не губляем мячы. У сустрэчах з больш моцнымі апанентамі аддаём пас — і мяч нейкім дзіўным чынам трапляе ў ногі. Трэба працаваць, развівацца. Гульцам неабходна выступаць у моцных клубах, добрых чэмпіянатах. І не баяцца ламаць сябе псіхалагічна. Тады ў нас будзе зборная вельмі высокага ўзроўню».

Адзначым, што правы крайні беларускай зборнай Мікіта Вайлупаў займае другое месца ў спісе найлепшых бамбардзіраў чэмпіянату Еўропы. На яго рахунку 47 дакладных кідкоў, лідар бамбардзірскай гонкі нарвежац Санэр Сагасен закінуў 51 мяч. Арцём Каралёк увайшоў у сімвалічную зборную чэмпіянату.

У паўфінальных матчах нарвежцы сустрэнуцца з харватамі, а іспанцы згуляюць са славенцамі. Зборныя Германіі і Партугаліі разыграюць пятае месца. Усе матчы пройдуць на «Тэле-2-Арэне» ў сталіцы Швецыі Стакгольме (умяшчальнасць трыбун — 35 000 гледачоў).

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# Ці прыбавяць адходы расходаў?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па словах **дырэктара ДУ «Апаратар другасных матэрыяльных рэсурсаў» Наталлі ГРЫНЦЭВІЧ**, за час дзеяння дакумента ў краіне ўдалося істотна палепшыць сітуацыю са зборам адходаў тавараў і ўпакоўкі. Так, калі ў 2012 годзе ўзровень выкарыстання адходаў быў 10 %, то за 2019 год, чакаецца, ён складзе 22,6 %. Аб'ёмы збору адходаў шкла павялічыліся ў тры разы, на 35 % — паперы і кардону. Сталі актыўна збіраць палімеры, бытавую тэхніку, шыны, адпрацаванае масла, электрычнае і электроннае абсталяванне, іртуцьзмяшчальныя лямпы, батарэйкі. За кошт чаго гэта ўдалося?

— Указ № 313 дазваляе эканамічна стымуляваць збор і нарыхтоўку другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР), — расказвае Анатоль Шагун. — Сродкі ад вытворцаў і імпарцёраў ідуць на развіццё сістэмы збору ДМР: павелічэнне колькасці нарыхтоўчых пунктаў, кампенсацыі зборшчыкам, закупку кантэйнераў, тэхнікі, абсталявання для іх падрыхтоўкі і выкарыстання, стварэнне вытворчасцяў па сартаванні і перапрацоўцы адходаў, у тым ліку тых відаў, якія раней не перапрацоўваліся.

**Пытанне абыходжання з адходамі тавараў і ўпакоўкі знаходзіцца на асаблівым кантролі Прэзідэнта Беларусі. Падчас нарады з кіраўніцтвам Савета Міністраў 14 студзеня Аляксандр Лукашэнка чарговы раз абазначыў важнасць вырашэння праблем у гэтай сферы. «Нельга дапусціць, каб нас напаткаў лёс краін-суседак, калі людзі задыхаюцца ад колькасці звалак, а глеба на дзесяцігоддзі атручана хіміяй», — заявіў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што стан навакольнага асяроддзя — найважнейшая задача, а здароўе беларусаў бясцэннае. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што гэта не толькі пытанне экалагічнага дабрабыту: «Развітыя краіны, у якіх, як і ў нас, няма багатых запасаў прыродных выкапняў, навучыліся атрымліваць неабходныя рэсурсы фактычна са смецця».**

## НОВЫЯ ВЫКЛІКІ

З 1 ліпеня 2020 года на змену Указу № 313 прыйдзе новы дакумент — Указ № 16 ад 17.01.2020 «Аб удасканаленні парадку абыходжання з адходамі тавараў і ўпакоўкі». Што ён зменіць?

— Тое, што было запісана ў дзеючай рэдакцыі, мае абмежаваны напрамак у частцы эканамічнага стымулявання збору і перапрацоўкі адходаў. Яно заключалася толькі ў рабоце з традыцыйнымі ДМР, — тлумачыць Анатоль Шагун. — Збор паперы, шкла, пластыку, шын, бытавой тэхнікі — гэта, безумоўна, важны сегмент, які займае 25—30 % ад усяго аб'ёму цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА). Але каб выкарыстоўваць іх на 90—100 %, як у многіх еўрапейскіх краінах, толькі перапрацоўкай ДМР нельга абмежавацца.

У 2017 годзе ўрадам была прынята Нацыянальная стратэгія абыходжання з цвёрдымі камунальнымі адходамі і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі на перыяд да 2035 года, якая ўлічвае як традыцыйныя, так і новыя напрамкі — энергетычнае выкарыстанне і апрацоўку арганічнай часткі ЦКА. Каб мець магчымасць эканамічна стымуляваць і гэтыя кірункі, былі ўнесены адпаведныя змены ў заканадаўства.

## БЕЗ ПЛАСТЫКУ

За апошнія дзесяцігоддзі пластык захапіў рынак тавараў і ўпакоўкі, а пластыкавыя адходы сталі адным з галоўных забруджвальнікаў наваколля — як сушы, так і Сусветнага акіяну. Каб зменшыць забруджванне пластыкам, быў прыняты План мерапрыемстваў, накіраваных на паэтапнае зніжэнне выкарыстання палімернай упакоўкі з яе замяшчэннем на экалагічна бяспечную — на аснове паперы, шкла, кардону і біяраскладанага пластыку. Ён быў зацверджаны пастановай Савета Міністраў № 7 ад 13.01.2020.

— Усе мерапрыемствы Плана можна ўмоўна раздзяліць на пяць блокаў, — расказвае **начальнік упраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі Мінпрыроды Вадзім ДЭМКО**. — Гэта вытворчасць і выкарыстанне экалагічна бяспечнай упакоўкі, у тым ліку біяраскладанай; навуковыя даследаванні па вызначэнні найбольш перспектыўных, экалагічна і эканамічна мэтазгодных тэхналогій атрымання бяспечнай упакоўкі, якія дазваляюць захаваць якасныя характарыстыкі і тэрміны прыдатнасці прадукцыі; тэхнічнае рэгуляванне, скарачэнне імпарту і вытворчасці палімернай упакоўкі; удасканаленне сістэмы абыходжання з адходамі, у тым ліку арганізацыя паасобнага збору ДМР і інфармацыйна-асветніцкая работа.

**— Ужо сёння ў буйных аб'ектах гандлю прадугледжваюцца альтэрнатыўныя варыянты замяшчэння аднаразовай палімернай упакоўкі шматразовай і экалагічнай.**

**— З 1 студзеня 2021 года будзе забаронена выкарыстанне і продаж аднаразовага пластыкавага посуду ва ўстановах грамадскага харчавання. Спіс такіх тавараў цяпер распрацоўваецца.**

**— У Беларусі ў найбліжэйшыя гады плануецца адмовіцца ад выкарыстання палімернай тары аб'ёмам больш за адзін літр для разліву піва і слабаалкагольных прадуктаў. Так, у суседняй Расіі з 2017 года ўжо дзейнічаюць абмежаванні на продаж піва і іншага алкаголю ў ПЭТ-тары аб'ёмам больш за 1,5 л.**




### Калі знікнуць смеццеправоды?

**Пытанне з заварваннем смеццеправодаў плануецца вырашыць у найбліжэйшыя год-два, расказаў намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Віталь Смірноў. Ён падкрэсліў, што гэта работа вядзецца пастаянна. Пры гэтым улічваецца меркаванне жыхароў, а таксама магчымасць будаўніцтва кантэйнерных пляцовак.**

**Некалькі гадоў таму ўсе смеццеправоды заварылі ў Гродне, а ў Гомелі гэта работа была завершана больш за 10 гадоў таму. Вядзецца яна і ў кожным буйным населеным пункце.**

## РЭГІЯНАЛЬНЫ ПАДЫХОД

Згодна з Планам, у краіне мяркуюць стварыць аб'екты па сартаванні і выкарыстанні ЦКА і палігоны для іх захавання. Так, прадугледжваецца завяршыць пераход ад раённых сістэм кіравання адходамі да рэгіянальнага ўзроўню. Будуць створаны 30 цэнтраў, куды стануць звозіць камунальныя адходы і сартаваць іх для вымання прыдатных ДМР. Там жа пабудуюць пляцоўкі для кампаставання і падрыхтоўкі адходаў для энергетычнага выкарыстання, перапрацоўкі буйнагабарытных і будаўнічых адходаў. Тое ж, што нельга пусціць у грамадзянскі абарот, будзе захоўвацца на палігонах, створаных там жа.

— Папярэднія падлікі паказваюць, што рэалізацыя гэтай канцэпцыі можа да 2030 года павысіць узровень выкарыстання камунальных адходаў да 55—60 %, — адзначыў Анатоль Шагун.

## БУТЭЛЬКА Ў ЗАЛОГ

Не пазней чым да 2022 года ў нашай краіне плануюць укараніць дэпазітную (залогавую) сістэму абарачэння спажывецкай упакоўкі. Адпаведны праект указа цяпер знаходзіцца на разглядзе ў Адміністрацыі Прэзідэнта.

Дэпазітная сістэма будзе распаўсюджвацца на ўсё, у што сёння разліваюцца напоі: ПЭТ-бутэлькі, шкляныя бутэлькі і слоікі, бляшанкі — за выключэннем малочнай тары. Астатнія віды ўпаковак застануцца ў сістэме паасобнага збору.

— Гэта сістэма падобная да той, што была ў Савецкім Саюзе, — кажа Анатоль Шагун. — Купляючы напой, чалавек пакідае ў краме залог за бутэльку (каля 20 кап.). Здаўшы ўжо пустую тару ў гэтай жа ці іншай краме, ён вяртае сабе залог. Такая сістэма дазволіць як мінімум у два разы павялічыць аб'ёмнай тары ў рэспубліцы, якая збіраецца. Плануецца, што яна дасць не менш за 80 % звароту.

## НАШТО ПАВЫШАЮЦЬ ЗБОР?

Каб вытворцы пераходзілі на «зялёны» бок і адмаўляліся ад выкарыстання пластыку ва ўпакоўцы, важна не толькі забараняць, але і эканамічна стымуляваць іх да выкарыстання альтэрнатыўных матэрыялаў, упэўнены Анатоль Шагун. Гэта прадугледжваюць і нормы Указа № 16.

Згодна з імі, каб не плаціць збор, трэба пашыраць выкарыстанне ў вытворчасці палімернай упакоўкі і вырабаў з пластмас пластыкавых адходаў. На сёння іх доля павінна складаць не менш за 30 % адходаў, з 2021 года — да 35 %, з 2023 года — 40 %.

— Яшчэ адна мэта Указа, якая атрымае сваё развіццё ўжо ў дакументах урада, — зрабіць так, каб бізнес больш актыўна пераходзіў ад прынцыпу «заплаціў і забыў» да стварэння ўласных кааперацыйных сістэм збору адходаў упакоўкі, без выплаты кампенсацыі, — гаворыць спецыяліст. — Дзякуючы гэтаму можна павялічыць аб'ёмы збору пластыку, дробнай бытавой тэхнікі і інш.

Прастымуляваць гэтыя змены прызвана і змяненне памераў платы за карыстанне пластыкавай упакоўкай, прадугледжанае пастановай Саўміна № 24 ад 16.01.2020. Плата будзе павышацца паэтапна: са 180 да 270 рублёў з 1 красавіка 2020 года і да 360 рублёў з 1 студзеня 2021 года. У сваю чаргу плануецца напалову (да 90 рублёў з 01.04.2020) знізіць плату за выкарыстанне біяраскладанай упакоўкі, вырабленай з расліннай сыравіны.

Пры гэтым, па словах Анатоля Шагуна, чакаецца, што павышэнне платы ў два разы не прывядзе да істотнага павелічэння кошту тавараў. Так, сёння збор за адну ПЭТ-бутэльку, якая важыць каля 40 г, складае 0,7 капеек у цане тавару. Пры павелічэнні збору да 360 рублёў. яна стане адпаведна 1,4 к. Што ж казаць пра поліэтыленавыя пакеты!

* * *

Каб меры па ўдасканаленні сістэмы збору адходаў і прадухіленні іх утварэння былі эфектыўныя, многае залежыць ад нашых з вамі простых дзеянняў: абмінаць смеццеправод і выкідаць пластык і змяшаныя адходы асобна; не ленавацца данесці батарэйкі ці люмінесцэнтныя лямпы да спецыяльных кантэйнераў, карыстацца ў краме не пластыкавымі пакетамі, а папяровым ці палатняным мяшочкам.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

### Куды здаваць адзенне

**Пакуль старое адзенне ў Беларусі амаль не перапрацоўваюць. У краінах жа Еўропы з яе вырабляюць напаўняльнікі для мэблі і аўтамабіляў ці спальваюць на цэментных ці смеццеспальвальных заводах. Апошні спосаб плануецца развіваць і ў нас. Але 10—15 % ад аб'ёму адзення можна выратаваць — перадаць тым, хто ў ім мае патрэбу, напрыклад, праз кантэйнеры Чырвонага Крыжа, устаноўленыя ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях, а таксама ў Мінску.**

---

Будзь у курсе

# ДАІ ўвяла платную паслугу

## Яна звязана з рэгістрацыяй транспарту

**У Дзяржаўтаінспекцыі Мінскай вобласці ўведзена ў дзеянне платная паслуга для фізічных і юрыдычных асоб: «Прыём дакументаў для ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур, звязаных з рэгістрацыяй транспартных сродкаў, па папярэднім запісе».**

Яна аказваецца на падставе заяўкі асобы (далей — заказчыка) па панядзелках у перыяд з 8.30 да 18.00 у будынку УДАІ УУС Мінскага аблвыканкама па адрасе: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 27, каб. 101.

Таксама заказчык можа пакінуць заяўку з аўторка па пятніцу з 8.00 да 17.00 па тэлефонах міжраённага аддзела (МРА) ДАІ УУС Мінскага аблвыканкама (017-2596170 і 017-3786298), у якой неабходна паведаміць наступныя звесткі: найменне арганізацыі (імя, імя па бацьку, прозвішча фізічнай асобы), адрас, колькасць транспартных сродкаў, у дачыненні да якіх будуць весціся рэгістрацыйныя дзеянні.

У прызначаны дзень заказчыкам прадастаўляюцца дакументы, прадугледжаныя пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 лютага 2012 г. № 156 альбо Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26.04.2010 № 200, а таксама копія дакумента, якая пацвярджае ўнясенне аплаты паслугі.

Аплата праводзіцца на р/р BY79BAPB363221591001000-00000 у рэгіянальную дырэкцыю па г. Мінску ААТ "Белаграпрамбанк", BICBAPBBY2X, атрымальнік — УУС Мінаблвыканкама, УНП — 600013515. Кошт паслугі за адзін транспартны сродак складае 10 рублёў.

Звярнуцца па такую паслугу грамадзяне (юрыдычныя асобы) могуць таксама ў рэгістрацыйна-экзаменацыйныя падраздзяленні (РЭП) ДАІ Мінскай вобласці, на тэрыторыі абслугоўвання якіх яны зарэгістраваны.

Аплатнае даручэнне, зробленае з выкарыстаннем сістэмы электронных плацяжоў, прадастаўляецца з адзнакай банка аб іх выкананні. Пры гэтым у адзнацы банка павінны ўтрымлівацца дата выканання плацежнага даручэння, арыгінальны штамп банка і подпіс адказнага выканаўцы (згодна з патрабаваннямі п. 4 арт. 251 гл. 27 Асаблівай часткі Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь).

### Даведка

За 2019 год міжраённым рэгістрацыйным падраздзяленнем ДАІ УУС Мінскага аблвыканкама зарэгістравана 31 280 транспартных сродкаў, знята з уліку — 68 154, унесена змяненняў у рэгістрацыйныя дакументы — 4992.

За названы перыяд супрацоўнікамі РЭП ДАІ выяўлена 14 транспартных сродкаў, якія знаходзіцца ў вышуку, два факты падробкі рэгістрацыйных дакументаў, 133 відазмяненні ідэнтыфікацыйнага нумара, па якіх устаноўлены факты падробкі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**




## ...І САПРАЎДНЫ ПАЛКОЎНІК!

Як пяецца ў вядомай песні: «Это было недавно, это было давно». У 60-х гадах мінулага стагоддзя, начытаўшыся кніг савецкіх пісьменнікаў і пасляхова скончыўшы інстытут, я паехала «падымаць» вёску. Да якога ўзроўню — гісторыя замоўчвае, але патрыятызм з мяне пёр і ўшыркі — аж да гарызонту, і ўвысь — да космасу.

Вёска прыняла мяне трохі насцярожана, а вось школа — чакала, бо да заняткаў лічаныя дні.

Заходжу ў настаўніцкую. Там трое маіх будучых калег, адна з якіх тут жа робіць заўвагу: маўляў, чаму гэта я сустрэла яе на вуліцы і не павіталася?

— Прабачце, — кажу, — але ж мы з вамі незнаёмыя?

— Гэта не мае ніякага значэння, — абрывае мяне жанчына. — Тут павінны вітацца ўсе.

— Добра, — згаджаюся. — Буду і я.

У настаўніцкую тым часам заходзіць завуч, падае мне спіс вучняў:

— Пазнаёмцеся, — кажа, — гэта 7 «Б». Вы ў ім будзеце класным кіраўніком.



Я, вядома ж, не супраць, я забяру спіс, учытваюся ў прозвішчы-імёны дзяцей, бо для мяне яны зусім непрывычныя — Тадэвуш, Эмануіл, Збыслаў, Тэрэза...

А вось нарэшце і сустрэча. Я рассаджваю ўсіх па росце і бачу, як рослы сусед стараецца выпхнуць з-за першай парты маленькага блізарукага хлопчыка, якога з пагардай і з усіх бакоў дражняць рыжым... Ну непарадак жа!

Вырашаю, што работу класнага кіраўніка трэба пачаць менавіта з яго, з Колі.

На наступны дзень прыношу паштоўкі — копіі карцін, на якіх намаляваны рыжавалосыя жанчыны, аб'яўляю тэму класнай гадзіны: «Што мы ведаем аб прыгажосці». Далей расказваю пра мастакоў, іх творы да гераінь, спыняюся каля першай парты і «здзіўляюся»:

— Дзеці, — кажу, — паглядзіце, а ў нашага Колі валасы акурат як на гэтых паштоўках! Кажуць, што такіх вось людзей змалку пацалавала сонейка, у самую макаўку...

Вучні пазіраюць на хлопчыка — нехта з цікавасцю, нехта з зайздрасцю, але ж гэтага мала.

У той час валасы ніхто не фарбаваў, не было ў продажы хны. Таму я, па адукацыі хімік-біёлаг, прыйшоўшы дамоў, папрасіла ў гаспадыні, у якой здымала пакой, шалупіння ад цыбулі, запарыла яго, дабавіла крышку марганцоўкі і... пафарбавалася ў рыжую. Назаўтра заявілася ў школу і адразу пайшла ў 7 «Б», спытала дзяцей:

— Ну, ці атрымаўся ў мяне такі колер валасоў, як у Колі?

— Не... У яго святлейшы! У вас цямнейшы! — загаманілі вучні.

— І праўда, у Колі — нашмат прыгажэйшы, — згадзілася я і тут жа ўбачыла, як засвяціўся твар таго маленькага рыжага хлопчыка, пачула, як пераможна, як радасна ён засмяяўся...

Вось так я пачынала заваёўваць самы каштоўны для настаўніка капітал — аўтарытэт у вачах дзяцей. І бацькоў, вядома ж, таксама.

Аднак пра гэты вясёленькі пачатак (ды праз дзесяцігоддзі!) я, напэўна, не ўспомніла б, калі б аднойчы да нас не заехаў той... Коля — палкоўнік у адстаўцы, і ўжо не рыжы. Прырода пафарбавала яго валасы спачатку ў цёмны колер, а потым і ў белы — сівы...

Ён, дарэчы, расказаў мне, што ў свой час быў і ў Траццякоўскай галерэі, і ў Эрмітажы, што яму вельмі цікава было ўбачыць там карціны, копіі якіх я прыносіла на класную гадзіну.

**Зоя Наваенка,**
*г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.*

## КЛІН КЛІНАМ

«Звязда» неяк правільна пісала, што ёсць такое месца, дзе чалавеку добра аднаму. Гэта — прыбіральня. Аднак з любога правіла бываюць выключэнні.

...Казалі, што да нас на фабрыку Ірына Данілаўна (імя зменена) прыйшла са школьнай парты і вучаніцай, досыць доўга працавала каля станка, потым завочна скончыла тэхнікум, і яе перавялі ў нарміроўшчыцы...

Карацей, звычайная біяграфія, звычайны кар'ерны рост: як да спецыяліста — прэтэнзій да яе не было, а вось як да чалавека...

Дзень пры дні, можна сказаць, «парадкуючы» грошы на рахунку «фірмы», яна ўцягнулася — узялася нармаваць і сваё жыццё, больш чым ашчадна расходаваць кожную капейку... Што было б зразумела, калі б жанчына не мела, напрыклад, свайго жылля, калі б гадавала сямёра дзяцей, даглядала хворых бацькоў. А то ж нічога такога: адна, у асобнай абжытай кватэры, сама сабе гаспадыня...

І пры гэтым зімой і летам у адной і той жа спадніцы, у старым паліто, адпачываць не ездзіць, у госці не ходзіць, абедае — не раўнуючы як мыш: згрызе нешта з шуфляды і ўсё. Нават чаю з усімі ніколі не п'е, бо на цукар і заварку трэба скідвацца, грошы даваць, а яна...

Мы спачатку нічога не зразумелі — проста заўважылі, што на работу наша Данілаўна прыходзіць з пустымі пластыкавымі бутэлькамі, а назад нясе поўныя.

Аказалася, што ў іх доме з'явіліся лічыльнікі вады і такім вось чынам наша эканамістка «пакрывае» свае расходы...

Мы не разумелі яе, шкадавалі, часам пасмейваліся і, вядома ж, не думалі, што станем... баяцца. Справа ў тым, што ў прыбіральні яна ніколі не ўключала святла (дома, відаць, таксама), а з часам перастала і... зашчапляцца. Бывала, дзверы адчыніш і ў крык, бо нечакана, непрыемна, страшна... А ў адказ табе — задаволены смех.

Мы абураліся, прасілі, жартавалі, што так яна цішком адмотвае сабе туалетную паперу, казалі, што заікамі нас паробіць...

Данілаўна слухала, неяк па-дзіцячы абяцала, што болей не будзе, а праз месяц-другі, некага спалохаўшы, зноў задаволена рагатала.

Колькі б гэта цягнулася, не ведае ніхто, бо ўрэшце нам дапамог выпадак. Адна з нашых жанчын спраўляла юбілей, зранку яе павіншавала кіраўніцтва, бліжэй да абеду «падцягнуліся» госці, у тым ліку і чужыя. Сярод іх быў Міхась Міхайлавіч — ну выліты мядзведзь: вялізны, непаваротлівы і вельмі акуратны. Перш чым узняць прапанаваны фужэр з шампанскім, ён спытаў (калектыў жаночы), дзе ў нас мыюць рукі мужчыны. Нехта паказаў яму, што гэта ў канцы калідора, але на першым паверсе... Чалавек жа, мусіць, не пачуў, таму спакойна пасунуўся на наш другі, расчыніў дзверы ў запаветную вузкую кабінку і...

Такога віскату мы ніколі яшчэ не чулі!.. Кінуліся ў прыбіральню. Першае, што ўбачылі — гэта шырокая спіна госця (развярнуцца ён яшчэ не паспеў), над якой не тое з бачка ўнітаза, не тое са сцяны дзіка верашчала галава Данілаўны.

...Яна, вядома ж, не расказала нам, што тады перажыла, але «засад» больш ніколі не рабіла, нікога не палохала.

Дарэчы, перад сыходам на пенсію яна збіралася пераехаць у вёску, дзе ўсё сваё і... бясплатная вада. Можа, куды і пераехала?

**А. Ж.,**
*г. Мінск.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

**АД ЯЕ Ж.** Як паведамлялася (гл. нумар «Звязды» за 17 студзеня), конкурс на найлепшую вясёлую і праўдзівую гісторыю з жыцця чытачоў «Звязды» працягваецца. Склад маленькага рэдакцыйнага журы застаецца амаль ранейшы: **старшыня — першы намеснік галоўнага рэдактара газеты спадарыня Наталля КАРПЕНКА, сябры — спецыяльныя карэспандэнты (яны ж маладыя матулі) Вераніка КАНЮТА і Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

Не адмовілася ад сваёй пасады (прынамсі, пакуль) і **старшыня вялікага чытацкага журы спадарыня Соф'я КУСЯНКОВА з Рагачоўшчыны,** дапамагаць якой у вызначэнні найлепшых гісторый можа кожны ахвотны.

Што для гэтага трэба? Дробязь, можна сказаць: па пятніцах, чытаючы рубрыку, пазначаць для сябе самыя цікавыя гісторыі — з тым, каб на фінішы года выбраць *сваю* дзясятку найлепшых і даслаць у рэдакцыю.

Пераможцаў — па традыцыі — чакаюць прызы.

Так што пішыце!

Неасабісты суб'ектыў



# Ананімная крыніца

### Нельга быць справядлівым напалову

«Паважаная рэдакцыя газеты «Звязда». Лісты, якія ляжаць у гэтым канверце, ужо дасланыя сваім адрасатам. Мы прапануем і вам азнаёміцца са становішчам у сацыяльна-педагагічным цэнтры вёскі С. Вельмі спадзяёмся на вашу дапамогу. Дынастыя Ш. разам з дырэктарам М. не павінна хадзіць па галовах іншых супрацоўнікаў. Тое, што прывозяць спонсары і проста людзі выхаванцам прытулку, павінна належаць менавіта выхаванцам, а не дынастыі Ш. разам з дырэктарам М., якія некалькі дзён запар кожны год выносяць поўныя сумкі з фруктамі, печывам, сокам, цукеркамі, бытавой хіміяй, спартыўнымі мячамі і шмат з чым яшчэ. А якія вялікія прэміі выпісвае кожны месяц сабе і сваім сваякам Ш., вы б пабачылі. І таксама брудна яна паступае, калі некалькі разоў, каб не ехаць у раён у цырульню, званіла і запрашала знаёмага майстра ў прытулак, стрыглася сама, стрыгліся яе сяброўкі-выхавальніцы. І дырэктар, ведаўшы пра гэта, нават не рабіў ім заўвагі. Гэта не той цырульнік, які прыязджае стрыгчы выхаванцаў прытулку. Гэта зусім іншы, гэта асабісты цырульнік Ш., да якога раней яна ездзіла ў раён стрыгчыся, а зараз зусім вядзе сябе нячыста, дайшла да таго, што на рабоце і ў рабочы час стрыжэцца разам з выхавальнікамі, мыюць галовы, з мокрымі галовамі ходзяць па прытулку, потым сядзяць з гэтым майстрам п'юць чай, а тэхнічка прыбірае за імі стрыжаныя валасы на падлозе. Дапамажыце, калі ласка, дабіцца справядлівасці! Дынастыя Ш. разам з дырэктарам М. павінны несці адказнасць за свае ўчынкі! За свае несправядлівыя адносіны да іншых работнікаў і за тое, што адбіраюць у пакрыўджаных лёсам выхаванцаў прытулку»...

Гэты допіс мне ўчора прынесла рэдактар аддзела пісьмаў са словамі: «Можа, возьмеш тэму для калонкі?» На пытанне, чаму не паслаць яго на рэагаванне ў абласное ўпраўленне адукацыі або не перадаць уласнаму карэспандэнту, каб разабраўся на месцы, мне красамоўна паказалі на канверт без канкрэтнага зваротнага адраса і адсутнасць подпісу ў канцы пісьма. Ананімка. Закон дазваляе іх не разглядаць. У журналісцкім выпадку нельга паехаць ці патэлефанаваць аўтару ці аўтарам «сігналу», удакладніць дэталі, паглядзець у вочы, калі на тое пайшло, — зразумець сітуацыю, аб'ектыўна яе ацаніць, зрабіць зноў жа аб'ектыўны матэрыял.

А тэма для калонкі — гэта калі ласка. І нават не адна. Можна разважаць пра сумленнасць і сумленне людзей, якія працуюць у сацыяльных установах. Можна разважаць пра агульны і непрадуманы падыход на месцах да вельмі добрай па сутнасці акцыі «Нашы дзеці», калі ў прытулак, дзе перад Новым годам было ўсяго два дзіцяці, везлі машыны падарункаў і пачастункаў, абы паставіць «птушачку». Можна, калі б была ўпэўненасць, што ўсё напісанае ў тым лісце — не элементарны паклёп. «Героі» допісу будуць казаць менавіта так, а тых, хто гатовы пацвердзіць, што ўсё напісанае — чыстая праўда, проста няма: яны так хаваюцца, што нават канверт, мяркуючы па паштовых штэмпелях, кідалі ў іншым горадзе...

Таму тэма застаецца адна — ананімкі. Чаму іх не варта разглядаць і чаму, нягледзячы ні на што, іх працягваюць пісаць. (А ў нашым канкрэтным выпадку ананімная крыніца не пашкадавала сіл і часу, каб напісаць і спонсарам, якія прывозілі падарункі, і ў рэдакцыі газет, і ў абласное ўпраўленне адукацыі. Пісьмы па змесце розныя, яднае іх, як ужо зразумела, адсутнасць якіх-кольвек канкрэтных звестак пра аўтара ды яшчэ чамусьці лейтматывам гучаць раскіданыя пасля стрыжкі валасы, якія пасля давялося змятаць прыбіральшчыцам...)

Замест адказу на першае пытанне ўспомню, калі дазволіце, выпадак з уласнай журналісцкай практыкі. Я тады ездзіла ў камандзіроўку па пісьму, у якім чалавек скардзіўся на ананімшчыкаў, што давялі яго жонку да бальніцы. Дакладней, на мясцовыя ўлады, якія зрабілі гэта, кіруючыся ананімкамі. Жонка-настаўніца прэтэндавала на месца завуча ў школе. Але камусьці гэта вельмі не падабалася, і ва ўсе інстанцыі на жанчыну пасыпаліся скаргі ад «добразычліўцаў», якія скарысталіся тым, што ў сужэнцаў прыёмныя дзеці. «Сігналізавалі», што малыя не дагледжаныя, што бацькі п'юць, пісалі ўсялякую лухту аб прыстойных нармальных людзях. На ўсе «сігналы» выязджала чарговая праверка (прыёмныя дзеці — на асаблівым кантролі), нічога крамольнага не выяўляла, пасля чарговага даносу зноў вярталася. Урэшце ў маці сямейства не вытрымалі нервы — і ад крыўды, ад пастаяннага напружання і яна злягла з сур'ёзным сардэчным прыступам. А праз нейкі час яны ўвогуле пераехалі ў іншае месца, дзе пастараліся пра ўсё забыць. Аўтар паклёпаў, якія фактычна ледзь не зламалі людзям жыццё, так і застаўся невядомым, а мясцовыя чыноўнікі, як прызнаваліся журналісту, назаўсёды вырашылі для сябе карыстацца правам, дадзеным законам: ананімныя лісты пакідаць без увагі.

**Утрымліваць лідарскія пазіцыі на рынку нафтапрадуктаў немагчыма без паслядоўнага развіцця. Яшчэ з канца 90-х гадоў мінулага стагоддзя акцыянернае таварыства «Нафтан» распачало шырокамаштабную паэтапную рэканструкцыю і мадэрнізацыю сваіх аб'ектаў. Гэтая работа працягваецца і цяпер. І калі ўвага грамадскасці накіравана пераважна на паведамленні са СМІ, што датычацца дамоўленасцяў нашай краіны па нафтагазавым пытанні з партнёрамі (якое ў любым выпадку будзе вырашана), на айчынным нафтавым гіганце працягваюць рэалізацыю значнага інвестпраекта. На мінулым тыдні спікер Савета Рэспублікі Наталля Качанава, як кіраўнік назіральнага савета прадпрыемства, правяла на «Нафтане» нараду па пытаннях яго мадэрнізацыі.**

стар. 2

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

## «ДЗЯКУЙ, ШТО ПАЧУЛІ»

### Пажылая пара з Брэста падзякавала віцэ-спікеру Савета Рэспублікі Анатолю Ісачанку за дапамогу

**Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Анатоль ІСАЧАНКА правёў прыём грамадзян у Брэсцкім аблвыканкаме. Магчымасцю задаць пытанне скарысталіся восем жыхароў рэгіёна, паведамляе БелТА.**

У прыватнасці, на прыём запісаліся пажылыя сужэнцы. Яны жывуць у цэнтры Брэста, вокны трохпавярхоўкі выходзяць на пешаходную вуліцу Савецкую. Месца прывабнае для бізнесу, таму шматлікія ўладальнікі прадалі свае кватэры, пасля чаго памяшканні былі пераведзены ў разрад камерцыйнага карыстання. Тыя жыхары, што засталіся (пераважна людзі сталага веку), цяпер суседнічаюць з кавярняй, рэстаранам, хостэлам, неўзабаве адкрыецца аптэка. Па словах пенсіянераў, канфліктаў з прадпрымальнікамі няма. Адзінае — не могуць знайсці паразумення па пытанні размяшчэння кандыцыянераў: яны знаходзяцца пад самымі вокнамі заяўнікаў. Здавалася б, дробязь, але гэта дастаўляе людзям нязручнасці.

Сенатар даручыў старшыні Брэсцкага гарвыканкама Аляксандру Рагачуку выехаць на месца. «Ёсць падыходы, каб прыбраць кандыцыянеры. Трэба па-гаспадарску, па-чалавечы вырашыць гэтае пытанне. Непазбежна, што ў цэнтры горада будуць з'яўляцца новыя аб'екты, але трэба дапамагчы людзям, пазбавіць іх дыскамфорту. Думаю, праз месяц-паўтара пад'еду туды, пагляджу, як вырашыцца гэтае пытанне», — сказаў намеснік старшыні Савета Рэспублікі. Муж і жонка засталіся задаволены такім адказам. Яны падзякавалі Анатолю Ісачанку за тое, што пачулі.

стар. 3


## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### Ведаць, каб дапамагаць



Аб чым ішла гаворка спікера Савета Рэспублікі на сустрэчы з актывам Віцебшчыны? стар. 2

### Адысці ад чэрствасці




...і чалавечай абыякавасці. З якімі праблемамі звярталіся да сенатараў падчас асабістых прыёмаў грамадзян? стар. 3, 4, 13

### Сусветны ўзровень



У Магілёве эксперты абмеркавалі планы развіцця сферы аховы здароўя на наступную пяцігодку. стар. 14

### Плён ад мадэрнізацыі



Як развіваецца завод, дзе самая вялікая колькасць тых, хто працуе ў Мастоўскім раёне, што на Гродзеншчыне. стар. 15

### Пад прыцэлам



Унікальная вытворчасць абаронча-ваеннай накіраванасці развіваецца ў Аршанскім раёне. стар. 16

# НАВАЦЫІ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ

**Даручэнні Прэзідэнта Беларусі па рэалізацыі інвестыцыйных праектаў у ААТ «Нафтан» павінны быць выкананы якасна і ў тэрмін. Пра гэта заявіла старшыня Савета Рэспублікі, кіраўнік назіральнага савета прадпрыемства Наталля КАЧАНАВА на нарадзе па пытаннях мадэрнізацыі «Нафтана».**

Спікер верхняй палаты парламента ўжо неаднаразова выязджала на гэтае прадпрыемства. На яе як на старшыню назіральнага савета ўскладзены абавязак кантраляваць выкананне даручэнняў Прэзідэнта па будаўніцтве ўстаноўкі запаволенага каксавання нафтавых рэштак і іншыя пытанні мадэрнізацыі прадпрыемства. «Я не вельмі задаволена ходам рэалізацыі праекта на «Нафтане», — адзначыла Наталля Качанава. — Мы абавязаны выканаць даручэнні кіраўніка дзяржавы, завяршыць работы ва ўстаноўленыя тэрміны. Часу засталося зусім мала».

Так, будаўніча-мантажныя работы трэба скончыць у маі, каб у жніўні атрымаць на прадпрыемстве першую прадукцыю.

«Павінна быць цеснае ўзаемадзеянне заказчыка і генпадрадчыка. Яны разам у рабочым парадку і аператыўна павінны вырашаць пытанні па пастаўках абсталявання, па праектна-каштарыснай дакументацыі, забеспячэнні неабходнай колькасці людзей, якія будуць задзейнічаныя ў рэалізацыі інвестпраекта», — адзначыла Наталля Качанава.

Пасля нарады спікер верхняй палаты парламента агледзела вытворчую тэрыторыю прадпрыемства, у тым ліку ўстаноўку запаволенага каксавання нафтавых рэштак, якая цяпер будуецца. «Гэта вельмі важны інвестпраект, які павінен быць рэалізаваны», — падкрэсліла яна.

Дарэчы, яго рэалізацыя дасць магчымасць павялічыць глыбіню перапрацоўкі нафтавай сыравіны з 72 % да 90 %, выхад светлых нафтапрадуктаў з 53—55 % да 65 % і атрымаць новы прадукт — нафтавы кокс. Ён выкарыстоўваецца ў якасці паліва ў цэментнай прамысловасці, а таксама ў энергетыцы. У сумесі з нізкасярністым коксам яго можна будзе ўжываць у металургіі.

Па словах генеральнага дырэктара прадпрыемства Аляксандра Дзямідава, «Нафтан» мае намер у маі распачаць пусканаладачныя работы на комплексе запаволенага каксавання.

Паралельна на «Нафтане» займаюцца іншымі кірункамі мадэрнізацыі. Так, у стадыі пусканаладачных работ знаходзіцца ўстаноўка па вытворчасці элементарнай серы.

Аляксандр Дзямідаў расказаў таксама пра першыя крокі па рэалізацыі стратэгіі «Нафтана», акцэнт у якой зроблены на нафтахімічным профілі. Першачарговая ўвага будзе звернута на завод «Палімір».

**Паводле БелТА.**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# ПУНКТЫ СУДАКРАНАННЯ

## Традыцыі, закладзеныя ва ўзаемаадносінах паміж Беларуссю і Узбекістанам, працягнуць развівацца

**У Савеце Рэспублікі прайшла сустрэча спікера верхняй палаты парламента Наталлі КАЧАНАВАЙ з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Узбекістана ў Рэспубліцы Беларусь Насірджанам ЮСУПАВЫМ.**


Фота БелТА.

Вітаючы госця, старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што ва ўзаемаадносінах паміж нашымі краінамі склаліся даўнія і добрыя сувязі. «Беларусь заўсёды разглядала Узбекістан як ключавога, стратэгічнага партнёра ў Цэнтральнай Азіі. Нашы міжпарламенцкія і міжурадавыя адносіны выйшлі абсалютна на новы ўзровень пасля візітаў кіраўнікоў нашых дзяржаў у 2018 годзе і ў 2019 годзе. За гэтыя два гады зроблена шмат — больш, чым за папярэдняе дзесяцігоддзе», — адзначыла Наталля Качанава.

Пасля леташняга візіту Прэзідэнта Узбекістана Шаўката Мірзіёева ў Беларусь план мерапрыемстваў, зацверджаны прэм'ер-міністрамі дзвюх краін, актуалізаваны, і сёння 30 % запланаваных мерапрыемстваў супрацоўніцтва выкананы, канстатавала спікер верхняй палаты парламента. Аснову партнёрства складаюць гандлёва-эканамічныя адносіны, якія дэманструюць станоўчую дынаміку.

Так, паводле звестак за студзень—лістапад 2019-га, аб'ём тавараабароту паміж нашымі краінамі склаў больш за 213 мільёнаў долараў і павялічыўся амаль на 50 % да ўзроўню адпаведнага перыяду 2018-га (рост паказалі як імпарт, так і экспарт, да таго ж сальда знешняга гандлю склалася са знакам плюс у памеры 124 мільёны долараў).

— Мы бачым, як павялічыліся лічбы нашых гандлёвых адносін, — звярнула ўвагу спікер верхняй палаты парламента і выказала ўпэўненасць у тым, што ўзаемавыгадныя адносіны будуць працягнуты і надалей.

Дарэчы, ва Узбекістане зарэгістравана 50 арганізацый, заснавальнікамі якіх з'яўляюцца юрыдычныя і фізічныя асобы Рэспублікі Беларусь. У сваю чаргу, у нашай краіне створана 61 арганізацыя, заснавальнікамі якіх выступаюць узбекскія юрыдычныя і фізічныя асобы.

Развіццю двухбаковых адносін спрыяюць і міжпарламенцкія стасункі. Так, летась на першым Форуме рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана з ініцыятывы тагачасных кіраўнікоў верхніх палат парламентаў абедзвюх краін быў падпісаны адпаведны мемарандум. Практыка паказала, што такая форма супрацоўніцтва выклікае ўзаемную цікавасць, асабліва гэта датычыцца прамысловай кааперацыі.

— Для нас вельмі важныя перспектывы па стварэнні сумесных вытворчасцяў і прадпрыемстваў, — адзначыла Наталля Качанава.

Трэба сказаць, што ў 2017-м на тэрыторыі Узбекістана з'явіліся дзве зборачныя вытворчасці беларускай тэхнікі з удзелам беларускага капіталу (у ліку сузаснавальнікаў — акцыянерныя таварыствы «Амкадор» і «Бабруйскаграмаш»). Цяпер вядзецца работа над стварэннем зборачнай вытворчасці спецтэхнікі ААТ «МАЗ». Што датычыцца сумесных праектаў, то ажыццяўляецца кааперацыйнае супрацоўніцтва МАЗа з Ташкенцкім заводам сельскагаспадарчай тэхнікі ў кірунку вытворчасці трактароў. А акцыянернае таварыства «Здравушка-мілк» летась стварыла сумеснае прадпрыемства, у межах якога плануецца пабудаваць завод па перапрацоўцы малака і малочнатаварны комплекс.

І гэта першыя крокі. Узбекскі бок зацікаўлены ў тым, каб на яго харчовым рынку з'явілася больш прадпрыемстваў з Беларусі. Аб гэтым у размове з журналістамі паведаміў пасол Узбекістана ў нашай краіне Насірджан Юсупаў.

Дыпламат праінфармаваў, што ў Ташкенце запланавана правядзенне вялікага аграрнага форуму, на які арганізатары запрасілі шэраг беларускіх прадпрыемстваў з прадукцыяй і прапановамі па асваенні ўзбекскага рынка.

Наталля Качанава выказала ўпэўненасць, што са зменамі, якія адбыліся, будуць працягнуты славутыя і добрыя традыцыі, закладзеныя папярэднікамі — кіраўнікамі палат мінулага склікання.

Нагадаем, што ў снежні 2019-га ва Узбекістане адбыліся выбары ў ніжнюю палату парламента, напярэдадні было абрана кіраўніцтва і створаны камітэты верхняй палаты. Урад згодна з Канстытуцыяй краіны падаў у адстаўку. Парламенцкія выбары летась прайшлі і ў Беларусі.

— Канешне, будзем працаваць над тым, каб гэтыя адносіны ўмацоўваліся і знаходзілі свой працяг літаральна па ўсіх кірунках, — адзначыла спікер верхняй палаты беларускага парламента, акцэнтаваўшы напрыканцы сустрэчы ўвагу на тым, што сяброўскія адносіны паміж народамі, парламентарыямі, урадамі нашых краін будуць выбудоўвацца надалей і знаходзіць усё больш пунктаў судакранання, якія дазволяць паспяхова развівацца і Узбекістану, і Беларусі.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

СЕНАТАРЫ ЗА РАБОТАЙ

# Ведаць, каб дапамагаць

## Дэпутаты павінны актыўна ўдзельнічаць у вырашэнні найважнейшых задач развіцця краіны

**Аб гэтым заявіла старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА на сустрэчы са старшынямі гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў Віцебскай вобласці.**

Сувязь Савета Рэспублікі з мясцовымі Саветамі дэпутатаў павінна быць пастаянна дзеючая і эфектыўная. «Мы павінны працаваць зыходзячы з тых задач, якія ўзнікаюць на тым ці іншым этапе развіцця нашай краіны. А лепш за ўсіх патрэбы, сладзяванні і пажаданні людзей ведаюць менавіта народныя абраннікі», — упэўненая старшыня Савета Рэспублікі.

Дэпутацкі корпус — гэта сувязное звяно паміж насельніцтвам і заканадаўцамі. «Інфармацыя, якой вы валодаеце на месцах, вельмі важная для нас, бо вы наўпрост зносіцеся і працуеце з людзьмі падчас розных сустрэч і мерапрыемстваў. Менавіта гэтая дзейнасць дазваляе нам сёння эфектыўна вырашаць задачы, якія стаяць у заканатворчай дзейнасці», — адзначыла Наталля Качанава.

Стварыць заканадаўчую базу няпроста, але яна ў Беларусі ёсць, усе заканадаўчыя акты выверaныя і зразумелыя. Іншае пытанне — як яны рэалізуюцца на месцах. Зыходзячы з гэтых задач і трэба працаваць з насельніцтвам, лічыць спікер верхняй палаты парламента.

— Падчас сустрэч становіцца зразумела, дзе трэба нешта карэктаваць або мяняць ці не варта наогул нічога чапаць, бо гэты закон працуе найлепшым чынам, — сказала яна. — Галоўнае, каб законы ішлі ад жыцця. Такую задачу паставіў перад парламентарыямі Прэзідэнт — значыць, мы павінны дакладна разумець, якая рэальная сітуацыя складваецца на месцах, якія пытанні хвалююць нашых грамадзян.

Старшыня Савета Рэспублікі даручыла ўдзельнікам сустрэчы данесці да ўсяго дэпутацкага актыву вобласці сутнасць праведзенага дыялогу, у тым ліку значнасць у іх дзейнасці работы з насельніцтвам і выбаршчыкамі. Наталля Качанава паабяцала, што сенатары будуць браць актыўны ўдзел у рабоце сесій і выканкамаў у рэгіёнах. «Гэта будзе вельмі важная форма работы. Яна дазволіць умацоўваць узаемасувязь паміж Саветам Рэспублікі і дэпутацкім корпусам іншых узроўняў, каб мы маглі аператыўна прымаць рашэнні, накіраваныя на павышэнне дабрабыту нашых грамадзян», — адзначыла спікер верхняй палаты парламента.

Асноўнае патрабаванне кіраўніка дзяржавы — справядлівае стаўленне да людзей: усе рашэнні, якія прымаюцца, павінны быць на карысць дзяржавы. Дэпутатам усіх узроўняў неабходна актыўна працаваць над вырашэннем пастаўленых задач, акцэнтавала ўвагу старшыня Савета Рэспублікі. Віцебская вобласць стала першай, дзе Наталля Качанава правяла сустрэчу са старшынямі гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў. Яна адказала на пытанні народных абраннікаў, а таксама выслухала іх прапановы.

Падчас сустрэчы спікер верхняй палаты парламента звярнула ўвагу на тое, што ў рабоце на любых пасадах заўсёды былі сустрэчы з людзьмі, бо гэта дапамагае быць у курсе самай актуальнай і дакладнай інфармацыі і пытанняў, якія хвалююць насельніцтва на месцах. Такую практыку яна мае намер працягнуць. «Гэта дазволіць зверыць гадзіннікі, паслухаць вас, даведацца, якія ёсць пытанні, прапановы», — падагульніла Наталля Качанава.

**Паводле БелТА.**

# Запыт на актыўную грамадзянскую пазіцыю дэпутатаў

**Пад старшынствам спікера верхняй палаты парламента Наталлі КАЧАНАВАЙ адбылося першае пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі сёмага склікання.**



## Разлік на плённую сумесную работу

Намеснікам старшыні Савета прызначаны Міхаіл Русы, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні. У склад гэтай структуры ўвайшлі старшыні сельскіх, раённых, гарадскіх і абласных Саветаў дэпутатаў, а таксама прадстаўнікі дзяржаўных органаў кіравання, у прыватнасці намеснікі старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта, міністра фінансаў, старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці, міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі, міністра юстыцыі і іншыя.

Дарэчы, якасны склад абноўленага Савета адзначыла Наталля Качанава. На яе погляд, у яго ўвайшлі людзі з вялікім жыццёвым і прафесійным досведам работы, у тым ліку і ў органах мясцовага самакіравання. Таму яна разлічвае на плённую сумесную работу. Спікер верхняй палаты



парламента звярнула ўвагу, што першае пасяджэнне Савета адбываецца цяпер у Мінску ў памяшканні Савета Рэспублікі. Далей яго пасяджэнні будуць абавязкова праходзіць у рэгіёнах.

І ўвогуле ў дзейнасці Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання магчымыя карэкціроўкі, перамены, бо жыццё не стаіць на месцы. Перспектыўнай формай работы Наталля Качанава назвала сустрэчы кіраўніцтва Савета Рэспублікі, сенатараў са старшынямі сельскіх, раённых, гарадскіх і абласных Саветаў дэпутатаў. Такая сустрэча ўжо адбылася ў Віцебскай вобласці. Чарговая на наступным тыдні пройдзе ў Магілёўскай, а потым і ва ўсіх астатніх абласцях краіны.

> Дэпутацкая работа павінна быць рэальная, эфектыўная, без фармалізму, і прыносіць канкрэтны вынік.

Нагадаем, Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання існуе ўжо больш за 10 гадоў. Па словах яго старшыні, сёння дэпутацкі корпус (больш за 18 тысяч чалавек) мае магчымасць у канцэнтраваным выглядзе бачыць праблемы, якія хвалююць людзей у рэгіёнах. У гэтым сэнсе Савет па ўзаемадзеянні служыць добрай пляцоўкай для вывучэння і абагульнення пытанняў, якія ўзнікаюць на месцах.

У ходзе пасяджэння члены Савета прынялі план работы на гэты год, таксама стварылі рабочую групу па падрыхтоўцы асноўнага пытання да чарговай сустрэчы на Савеце.

## Удакладненне задач

На пасяджэнні таксама адбылася грунтоўная размова аб шляхах удасканалення работы дэпутатаў з насельніцтвам у рэгіёнах, канкрэтным удзеле народных абраннікаў у вырашэнні праблем мясцовага значэння.

Сваімі думкамі і поглядамі на гэты конт падзялілася з прысутнымі Наталля Качанава. Яна падкрэсліла, што дэпутацкая работа павінна быць рэальная, эфектыўная, без фармалізму, і прыносіць канкрэтны вынік. Першы сярод прыярытэтаў — клопат пра людзей, рост іх дабрабыту, павышэнне ўзроўню якасці жыцця. А гэта і працоўная занятасць насельніцтва, і цэны ў крамах на тавары штодзённага попыту, і заробкі.

«Наша актыўная грамадзянская дэпутацкая пазіцыя павінна гучаць больш дакладна і зразумела, наш голас — быць больш чутным і прыкметным пры вырашэнні асноўных задач, якія стаяць перад краінай», — сказала Наталля Качанава.

Спынілася спікер і на неабходнасці ўзмацнення работы з моладдзю. Цяпер у Беларусі ствараецца маладзёжны парламент. Мяркуецца, што ў яго склад увойдуць па 10 юнакоў і дзяўчат ад кожнай вобласці і Мінска. Мы будзем з імі актыўна працаваць. Гэта кадравы рэзерв. Трэба бачыць перспектыўных маладых людзей, будучых лідараў», — сказала Наталля Качанава.

У сваім выступленні спікер Савета Рэспублікі яшчэ раз заклікала калег дэпутатаў звяртаць асаблівую ўвагу на работу з людзьмі. На яе погляд, гэта і рэгулярныя прыёмы па асабістых пытаннях, і сустрэчы ў працоўных калектывах, і справаздачы мясцовых органаў улады перад насельніцтвам. Бо калі людзі інфармаваныя, у іх узнікае менш пытанняў.

Наталля Качанава падзялілася з прысутнымі назіраннем аб папярэдніх выніках студзеньскіх прыёмаў грамадзян старшынямі пастаянных камісій у Савеце Рэспублікі. Гэтыя прыёмы паказалі, што большасць пытанняў, якія ўздымалі людзі, магла быць вырашана на мясцовым узроўні. Спікер заявіла, што такая форма работы працягнецца, сенатары будуць практыкаваць і выязныя прыёмы, а таксама працаваць з электроннымі і пісьмовымі зваротамі, бо ў іх утрымліваецца шмат цікавых прапаноў.



## Дарогу мясцовым ініцыятывам

**Старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар ЖУК** у сваім выступленні якраз і засяродзіўся на ролі органаў мясцовага самакіравання па ўдасканаленні работы з насельніцтвам і вырашэнні іх злабадзённых жыццёвых пытанняў. І ў размове з журналістамі ён развіў гэтую тэму.

У прыватнасці, Ігар Георгіевіч падзяліўся думкай аб неабходнасці стварэння ў рэгіёнах пры органах улады спецыяльных фондаў фінансавай падтрымкі мясцовых ініцыятыў. Гэтыя фонды дазволяць далучаць грамадзян, жыхароў канкрэтных населеных пунктаў да вырашэння тых праблем, якія там існуюць, упэўнены дэпутат. Па яго словах, людзі павінны ведаць, што іх думкі будуць пачуты, а слушная ініцыятыва ўспрынята. Трэба даць ім магчымасць паверыць у тое, што яны ў сілах самастойна змяніць сітуацыю, могуць удзельнічаць у рэалізацыі сацыяльных праектаў, неабходных для паляпшэння іх жыцця. Сёння людзі разлічваюць на дэпутатаў, чакаюць ад органаў мясцовага самакіравання эфектыўнай работы па вырашэнні праблемных пытанняў, з якімі яны сутыкаюцца ў рэгіёнах, кажа Ігар Жук.

Ён назваў сустрэчы дэпутатаў у рамках Савета па ўзаемадзеянні важнымі і карыснымі. На думку дэпутата, яны дазваляюць выпрацоўваць шляхі паляпшэння дзейнасці органаў мясцовага самакіравання, рабіць яе больш эфектыўнай.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

# «ДЗЯКУЙ, ШТО ПАЧУЛІ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

У заблытанай сітуацыі апынулася шматдзетная сям'я з Жабінкі. Да шлюбу жанчына атрымала ў Брэсце зямельны ўчастак. Калі сямейнае становішча змянілася, разам з мужам пераехала ў суседні райцэнтр. Там, скарыстаўшыся льготным крэдытам, маладыя сужэнцы пабудавалі двухпакаёвую кватэру. Паколькі будаўніцтва на брэсцкім участку не было выканана своечасова, яго, па законе, абавязаны выключыць. Маладыя людзі хацелі б выкупіць участак па кадастравым кошце, каб прадаць яго і палепшыць свае жыллёвыя ўмовы ў Жабінцы.

Старшыня Брэсцкага гарвыканкама растлумачыў, што лёс участкаў з незавершаным будаўніцтвам вырашае суд, пасля чаго іх выстаўляюць на паўторныя аўкцыённыя таргі. «Праводзім ацэнку ўчастка з незавершаным будаўніцтвам, вылічваем каэфіцыент кадастравага кошту і кошту падмурка. Пры рэалізацыі ўчастка на аўкцыёне ў такой жа прапорцыі выплачваем суму панесеных выдаткаў з улікам гэтага каэфіцыента», — адзначыў Аляксандр Рагачук.

Па даручэнні Анатоля Ісачанкі юрысты вывучаць і іншыя варыянты вырашэння сітуацыі. «Усё павінна быць строга па заканадаўстве. Пытанне складанае, дам даручэнне спецыялістам разабрацца ў гэтай сітуацыі. Калі можна дапамагчы, будзем з горадам разма́ўляць», — сказаў ён.

На прыёме грамадзян пабывалі жыхары Брэста і найбліжэйшых раённых цэнтраў. Падводзячы вынік сустрэчы з насельніцтвам, намеснік старшыні Савета Рэспублікі адзначыў, што частка агучаных праблем датычылася кампетэнцыі мясцовых органаў улады. Нягледзячы на гэта, кожнае пытанне будзе ўзята на кантроль і старанна прапрацавана.



Фота БелТА.

УВАГА — РЭГІЁНАМ

# ШТО МОЖА ДЭПУТАТ?

**У рамках адзінага дня інфармавання насельніцтва на Бераставіччыну завітаў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ. Ён сустрэўся з калектывамі цэнтральнай раённай бальніцы і аграфірмы «Стары Дворац».**



> Сустрэчы з людзьмі, асабістыя прыёмы грамадзян, выязныя прыёмы дапамагаюць не толькі пачуць і дапамагчы канкрэтнаму чалавеку, але і ўбачыць, дзе не спрацоўваюць нейкія кірункі, тэндэнцыі на ўзроўні рэгіёна, краіны, каб своечасова змяніць законапраект і ў далейшым сістэма працавала без збояў.

Падчас сустрэчы ішла размова аб сітуацыі на рынку працы нашай краіны, занятасці і заработнай плаце работнікаў бюджэтных сфер. Віктар Лісковіч заўважыў, што заробак ніводнага з работнікаў установы аховы здароўя ў студзені не павінен быць меншы, чым у лістападзе мінулага года.

Акрамя таго, старшыня профільнай камісіі звярнуў увагу на ролю дэпутатаў рознага ўзроўню ў вырашэнні надзённых праблем людзей на канкрэтнай тэрыторыі, аб наданні галоснасці гэтай дзейнасці праз СМІ, асабліва мясцовы друк:



— Трэба, каб людзі, якія не прысутнічалі на сустрэчах, ведалі, пра што там ішла гаворка, — падкрэсліў сенатар. — Сустрэчы з людзьмі, асабістыя прыёмы грамадзян, выязныя прыёмы дапамагаюць не толькі пачуць і дапамагчы канкрэтнаму чалавеку, але і ўбачыць, дзе не спрацоўваюць нейкія кірункі, тэндэнцыі на ўзроўні рэгіёна, краіны, каб своечасова змяніць законапраект і ў далейшым сістэма працавала без збояў.

Віктар Лісковіч расказаў пра свае планы дэпутацкай дзейнасці ў рэгіёнах, адказаў на пытанні прысутных. У прыватнасці, пра тое, якія заканадаўчыя акты, што датычацца непасрэдна аховы здароўя і ў цэлым сацыяльнай сферы, плануецца разгледзець у Савеце Рэспублікі, як прыцягнуць моладзь да заканатворчай дзейнасці і як спыніць адток маладых медыкаў за межы краіны.

На сустрэчы з калектывам аграфірмы «Стары Дворац» размова ішла і аб сацыяльнай палітыцы, будаўніцтве жылля для маладых спецыялістаў і замацаванні іх на роднай зямлі.

Пасля сустрэчы сенатар наведаў рамонтныя майстэрні аграфірмы, пазнаёміўся з вытворчымі і бытавымі ўмовамі, пабываў у базавай школе.

**Па матэрыялах «Бераставіцкай газеты».**

# АДЫСЦІ АД ЧЭРСТВАСЦІ І ЧАЛАВЕЧАЙ АБЫЯКАВАСЦІ,

## альбо Дайце даведку на даведку!

**НА прыём грамадзян па асабістых пытаннях да старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктара ЛІСКОВІЧА прыйшлі 14 чалавек са сваім набалелым. Зваротаў магло б быць і менш, калі б на мясцовым узроўні да разгляду турбот заяўнікаў падышлі больш уважліва. Але пра ўсё па парадку.**

Састарэлага мінчаніна Аляксандра Іванавіча на прыём прывяла дачка — сам ён інвалід II групы па зроку і самастойна не тое што на вуліцу, па кватэры перасоўвацца наўрад ці зможа. Там ён жыве разам са сваёй жонкай, якая з-за ўзросту таксама не надта здаровая. Асноўная праблема, што прывяла 82-гадовага мужчыну ў Савет Рэспублікі, — адмова ў прызнанні яго адпаведнай камісіяй інвалідам I групы. Па словах заяўніка, на вырашэнне пытання, якое яго хвалюе, паўплывала сотая доля працэнта ў вымярэнні яго магчымасці бачыць... Каб паставіць кропку, мужчыне параілі ісці ў суд.

— З кім мне судзіцца?! Я сляпы чалавек, — бядуе ён.

Уважліва выслухаўшы ўсе турботы састарэлага мінчаніна, Віктар Лісковіч пацікавіўся, калі сацыяльныя службы наведвалі яго апошні раз, бо нават немедыку (а старшыня камісіі, дарэчы, доўгі час працаваў у сферы аховы здароўя. — **Аўт.**) бачна, што мужчына мае патрэбу ў пастаяннай староннай дапамозе. Як высветлілася, ніколі.

> Самае галоўнае — мы павінны адысці ад чэрствасці, чалавечай абыякавасці ў вырашэнні тых ці іншых пытанняў, якія маглі (і павінны былі б) вырашыць без звароту грамадзяніна.

— Мы павінны сёння адыходзіць ад заяўнага прынцыпу аказання дапамогі: ведаеш, ідзеш і прапануеш тыя магчымасці, якія сёння прадугледжаны законам! — абурыўся такому стаўленню да чалавека Віктар Андрэевіч і паабяцаў не пакінуць гэтае пытанне без увагі: ён даручыў адрасаваць зварот у абодва міністэрствы — працы і сацыяльнай абароны і аховы здароўя, каб, падрабязна вывучыўшы гэтую тэму, праінфармаваць аб выніках заяўніка.

Аналагічны па танальнасці атрымаўся і другі зварот — зноў састарэлы чалавек, зноў са сталіцы, зноў інвалід II групы, розніца толькі ў тым, што зусім адзінокі... Рыгор Аляксеевіч прыйшоў да старшыні профільнай камісіі са скаргай на тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання аднаго з мінскіх раёнаў. Мауляў, я да іх — а яны ад мяне! У якасці прыкладу расказаў, як запісаўся на прыём грамадзян па асабістых пытаннях,



Фота БелТА.

> Колькі гадоў вы зарэгістраваны ў гэтым тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнай абароны?
> **— Тры.**
> — А колькі разоў да вас як адзінокага чалавека адтуль прыйшлі?
> **— Ніводнага...**

а замест прыёму... нічога: адказнай асобы на месцы не аказалася — ці то забылася, ці то яшчэ якая трасца! Аднак гэта не адзіны абуральны з яго пункту гледжання факт. Вырашыўшы асвоіць функцыянал смартфона, які набыў сабе, запісаўся на курсы камп'ютарнай адукаванасці. Дык вось, каб стаць слухачом тых курсаў (працягласцю, дарэчы, усяго некалькі гадзін), у пенсіянера запатрабавалі даведкі, ды не адну... Аб стане здароўя, месцы жыхарства і складзе сям'і. Усё б нічога, але ў мясцовай паліклініцы нават не вы-даюць, якую даведку трэба выдаць для наведвання курсаў, разлічаных на 2-3 заняткі працягласцю некалькі гадзін.

— Навошта ўсе гэтыя даведкі?! — задае рэзоннае пытанне заяўнік і, дарэчы, мае рацыю.

— Колькі гадоў вы зарэгістраваны ў гэтым тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнай абароны? — спытаў Віктар Лісковіч.

— Тры.

— А колькі разоў да вас як адзінокага чалавека адтуль прыйшлі?

— Ніводнага...

Як кажуць, заслона!

— У рабоце, дзе ёсць хворыя, адзінокія людзі, павінен дзейнічаць перш за ўсё выяўляльны прынцып. Не трэба чакаць, каб чалавек хадзіў з праблемамі па інстанцыях, — упэўнены Віктар Андрэевіч. — У нас выбудаваная сістэма адказных асоб, якія павінны выканаць гэтую работу па сваім функцыянале. Таму, канешне ж, незразумела: чаму састарэламу чалавеку даводзіцца звяртацца ў Савет Рэспублікі, каб навучыцца рабоце са смартфонам?! Такіх выпадкаў не павінна быць. Мы будзем выпраўляць гэтыя пытанні.

Ён прапанаваў абмеркаваць з профільнымі міністрамі агучаныя на прыёме грамадзян тэмы, каб работа была пабудавана не толькі ў адносінах да аднаго чалавека, а ў дачыненні да ўсіх, хто патрабуе дапамогі.

— Самае галоўнае — мы павінны адысці ад чэрствасці, чалавечай абыякавасці ў вырашэнні тых ці іншых пытанняў, якія маглі (і павінны былі б) вырашыць без звароту грамадзяніна, — падкрэсліў у размове з журналістамі старшыня Пастаяннай камісіі, падагульняючы прыём грамадзян. — Мы павінны не чакаць гэтага звароту, а прыйсці да чалавека, вызначыцца з аб'ёмамі дапамогі і пабудаваць сістэму яе аказання. Вось тады людзі будуць верыць і разумець, што калі ты трапіш у нестандартную жыццёвую сітуацыю — на гэты выпадак ёсць сацыяльная абарона.

> У рабоце, дзе ёсць хворыя, адзінокія людзі, павінен дзейнічаць перш за ўсё выяўляльны прынцып. Не трэба чакаць, каб чалавек хадзіў з праблемамі па інстанцыях.

Віктар Лісковіч засяродзіў увагу на тым, што любы грамадзянін, які звяртаецца ў Савет Рэспублікі, мае права разлічваць на тое, што яго пачуюць і дапамогуць. Дарэчы, у гэты дзень прагучалі і іншыя тэмы: медыцынскага забеспячэння, працаўладкавання, спагнання запазычанасці па аліментах, удасканалення работы сродкаў масавай інфармацыі. Усе яны ўзятыя на кантроль, па кожным пытанні заяўнікам будуць дадзены абгрунтаваныя адказы ў вызначаныя заканадаўствам тэрміны.

**Вольга АНУФРЫЕВА**

Тэлесеткі

# Цана жыцця, гонару і свабоды

**На тэлеканале «Беларусь 3» з 28 студзеня пачнуцца паказы дакументальнага кінацыкла «Хроніка Мінскага гета», рэжысёрамі якіх выступілі Уладзімір Луцкі і Людміла Клінцова (дарэчы, сёлета аўтарскі калектыў «Хронік» атрымаў Спецыяльную прэмію Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва).**

Першы фільм, які будзе прадстаўлены ўвазе гледачоў у аўторак, раскажа пра трагедыю вязняў яўрэйскага гета ў беларускай сталіцы. Стужку здымалі да 70-годдзя ліквідацыі Мінскага гета. Створана яно было 17 ліпеня 1941 года па загадзе нямецкіх акупацыйных улад, а 21 кастрычніка 1943 года яўрэйскае гета было ліквідавана. За гэты час праз яго прайшло больш за 80 тысяч людзей — у тым ліку дзеці, жанчыны, людзі сталага веку, яўрэі з Мінска і ваколіц, а таксама вязні з Германіі, Аўстрыі, Чэхіі... Працяглы час лічылася, быццам гісторыя Мінскага гета завяршылася ў 1943-м. Але мала хто ведаў, што ў падвале дома, які знаходзіўся на самым ускрайку закрытай тэрыторыі, хаваліся некалькі яўрэйскіх сем'яў. У гэтых людзей быў свой летапіс тых падзей, і ён адрозніваўся ад афіцыйнай даты на 9 месяцаў. У дзень вызвалення Мінска, 3 ліпеня 1944 года, у літаральным сэнсе з падполля выйшлі 13 чалавек — толькі палова з 26, што ўратаваліся...

За час здымак, якія праходзілі не толькі на тэрыторыі нашай краіны, але і ў ЗША, Ізраілі, Польшчы, стваральнікам фільма ўдалося сабраць унікальныя дакументы і ўспаміны пра той час.

З 29 да 31 студзеня будуць прадстаўлены і іншыя фільмы дакументальнага цыкла — «Хроніка Мінскага гета. Фільм другі. За гонар і свабоду» (2015), «Хроніка Мінскага гета. Фільм трэці. Народжаныя двойчы» (2017), «Хроніка Мінскага гета. Фільм чацвёрты. Зондэргета» (2018, рэжысёр Людміла Клінцова). У іх стваральнікі раскрываюць малавядомыя факты пра тое, як людзі змагаліся за жыццё ў невыносных жыццёвых абставінах, каго ратавалі і хто ратаваў у падполлі вязняў гета на нашых землях.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 86

Аўтар сённяшняй задачы — Аляксандр Панкрацьеў ***(гл. дыяграму)***.



**Белыя:** Кре5, Фd4, Лg1, Kg3, Kh1 (5).

**Чорныя:** Kph2, пg2 (2).

Мат за 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, Мінск, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Ва Украіне фінішаваў міжнародны конкурс па складанні кампазіцый, прысвечаны 64-годдзю шахматнага кампазітара Генадзя Казюры. У раздзеле задач на зваротны мат за 2 хады першы і другі прызы атрымалі кампазіцыі беларускага майстра Міхаіла Храмцэвіча. Сярод гэткіх жа задач-трохходовак задача Міхаіла Храмцэвіча і Віктара Волчака адзначана другім прызам, а задача Аляксандра Міхалапа (усе — Беларусь) атрымала ганаровы водгук. Нагадаем, што ў задачах на зваротны мат белыя вымушаюць (!) чорных даць ім (белым) мат. Прааналізуем задачу М. Храмцэвіча, адзначаную першым прызам.

**Белыя:** Кре6, Фd6, Лh4, Cb6, Cf3, Kb1, Kd1, пп. c7, d7, e7, f5 (11).

**Чорныя:** Крc4, Фа7, Ла6, Лf8, Cb3, Cf4, Kb8, Kh5, пп. a4, b4, b5, c2, d3, f6 (14).

Рашае 1. Се2! ~ 2. Ф:b4+ Кр:b4х, 1...de 2. Фd3+ Кр:d3х; 1...Л:b6 2. Л:f4+ K:f4х, 1...Ф:b6 2. Ke3+ Ф:e3х; 1...Kc6 2. Фd4+ K:d4х, 1...K:d7 2. Фc5+ K:c5х

* * *

У канцы мінулага года адбыўся чарговы Гран-пры Варшавы па рашэнні шахматных кампазіцый. У спаборніцтве ўзялі ўдзел 16 рашальнікаў з Польшчы, Расіі, Украіны, Беларусі, Літвы, Марока і Швейцарыі. Беларускія ўдзельнікі Аляксандр Булаўка і Мікалай Сігневіч у галоўным турніры фінішавалі дастаткова далёка ад п'едэстала, але ў адным з «пабочных» турніраў занялі адпаведна другое і трэцяе прызавыя месцы.

* * *

Міхаіл Нікіценка заняў 8-е месца з 84 на турніры ў польскім Кракаве, а Мікіта Маёраў паказаў такі ж вынік пры 165 удзельніках у іспанскай Лорцы. На мемарыяле Л. Заменгофа ў Беластоку (42 гульцы) з беларусаў найлепшыя былі Арцём Стрыбук (12-е месца) і Юрый Ціханаў (23-е).

* * *

Прапануючы чарговыя партыі беларускіх шахматыстаў (і гросмайстарскага, і ніжэйшага ўзроўню), адзначым, што ў шахматах часам шмат каштуе нават адна памылка...

Манвел Пагасян — Аляксей Аляксандраў (Сочы, 2019). 1. d4 Kf6 2. c4 e6 3. Kf3 d5 4. g3 Ce7 5. Cg2 0-0 6. 0-0 dc 7. Ke5 Kc6 8. C:c6 bc 9. K:c6 Фd7 10. K:e7+ Ф:e7 11. Фa4 e5 12. de Ф:e5 13. Ф:c4 Ce6 14. Фd3 Лad8 15. Фe3 Фh5 16. f3 Лfe8 17. Фg5 Фh3 18. Kc3 Cc4 19. Ce3 Kd5 20. C:a7 K:c3 21. bc C:e2 22. Cd4 f6 23. C:f6 Лd7 24. Лf2 h6 25. Фf4 gf 26. Лe1 Лd1 27. Л:d1 C:d1 28. Фd2 Ca4 29. g4 Cc6 30. Фd1 Крf7 31. Лf1 Крg7 32. Фd3 Лe7 33. c4 h5 34. g5 fg 35. Фd4+ Крg6 36. Фh8 Лe8 37.Фb2 Фe6 38. Фc2+ Фf5 39. Фc3 Фe5 40. Фc2+ Крh6 41. Лf2 Фd4 42. h3 C:f3 43. Фf5 Лe1+ 44. Крh2 Ф:f2х

Юрый Аксяневіч — Уладзіслаў Каташук (Брэст, 2019). 1. d4 Kf6 2. Kf3 e6 3. c4 Cb4+ 4. Kbd2 Фe7 5. a3 C:d2+ 6. C:d2 b6 7. e3 Cb7 8. Cd3 d6 9. Фe2 Kbd7 10. e4 e5 11. de de 12. Cc3 0-0 13. b4 Kh5 14. g3 g6 15. 0-0 c5 16. Фb2 f6 17. Лad1 Kg7 18. Kh4 Ke6 19. Kg2 Kd4 20. C:d4 cd 21. f4 Лac8 22. Лc1 Крg7 23. Лfe1 Ca6 24. Фe2 Лc7 25. Лc2 Лfc8 26. Лec1 Cb7 27. Лf1 a5 28. Лb1 Ca6 29. b5 Cb7 30. Лbc1 Ф:a3 31. Лa2, 0:1.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1. Kf3! Кр:K 2. Лg6, 1...Крf5 2. Kf2, 1...Крh5 2. Ke5. Камбінацыя з партыі: 1. Лe8+ Cf8 2. Ch6 з непазбежным 3. Л:f8х. Першыя правільна адказалі Васіль Жуковіч, Ігар Ананіч, Уладзімір Ізотаў, Сяргей Цяльпук, Віктар Жук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**



Дзеля памяці

# АПОШНІ ЧАРАЎНІК



**Споўнілася 10 гадоў, як пайшоў з жыцця рэжысёр Леанід Нячаеў**

Ён марыў стварыць цэлую энцыклапедыю сусветных класічных казак, але амаль кожны свой фільм ледзь прабіваў праз заслоны цэнзуры.



Цягам 17 гадоў ён працаваў на «Беларусьфільме» і за гэты час зняў 9 стужак для дзяцей, у тым ліку тыя, якія гледачы дагэтуль называюць найлепшымі: «Пра Чырвоную Шапачку», «Прыгоды Бураціна», «Рыжы, сумленны, закаханы», «Прададзены смех», «Казка пра Зорнага хлопчыка», «Пітэр Пэн», «Не пакідай...»

У скарбонцы яго ўзнагарод — Дзяржаўная прэмія Расійскай Федэрацыі, якая дапамагла пратрымацца фінансава ў 90-х, і прыдуманы дзецьмі Зеленаградска ордэн Бураціна, які падтрымліваў маральна ў самыя складаныя перыяды і дапамагаў верыць, што яго казкі любяць і чакаюць.

### Сказана!

- «Гэта проста свята нейкае!» (Карабас-Барабас, «Прыгоды Бураціна».)
- «А хто спрабаваў з'есці слана?» (Тоўсты Воўк, «Пра Чырвоную Шапачку».)
- «Таямніца — гэта для душы, а ты ўсё да страўніка прыладжваеш». (Людвіг, «Рыжы, сумленны, закаханы».)
- «З усіх выбухаў я прызнаю толькі выбух смеху». (Настаўнік, «Прададзены смех».)
- «Раней я лічыла, што мудрасць — гэта як справядлівасць, а цяпер лічу, што мудрасць — гэта як мае шторы, больш падобная да асцярожнасці...» (Сава, «Рыжы, сумленны, закаханы».)

Апошні яго фільм — бюджэтная «Дзюймовачка» — выйшаў у 2007-м. Рэжысёр асабіста прадстаўляў яго ў Мінску і Віцебску на кінапраграме «Славянскага базару», нагадаў, што казкі сёння нікому не патрэбныя, а ў ролі новых казачных герояў, напрыклад, у так і не зробленым фільме «Ямеля», спонсары прапанавалі яму здымаць Цімаці...

І ўсё ж у памяці самай шчырай публікі — дзіцячай — ён застаўся як добры чараўнік, які ўмеў «стварыць натуральны асяродак» і знайсці падыход абсалютна да ўсіх маленькіх акцёраў на здымачнай пляцоўцы, які адразу «бачыў» сваіх герояў сярод дзясяткаў хлопчыкаў і дзяўчат на кастынгу і нават проста ў натоўпе, і яшчэ які здымаў не проста казкі, а музычныя, кожная песня з якіх станавілася хітом.



Дарослыя ж цанілі ў работах рэжысёра фірменную хітрынку, умела схаваную паміж радкоў іронію і сацыяльны падтэкст, ды яшчэ адсутнасць маралізатарства: у Нячаева не было адназначна «чорных» і «белых» персанажаў, а зло часта тлумачылася не жаданнем крыўдзіць дабро, а адсутнасцю любові. Ці не за ўсё гэта мы любім яго фільмы дагэтуль?

**Фота vokrug.tv.**



### Ці ведаеце вы, што...

- У фільме «Прыгоды Бураціна» гучаць песні на вершы Булата Акуджавы «На дурня не патрэбны нож» і «Не хавайце вашы грошыкі».
- Самыя ўдалыя гісторыі Леанід Нячаеў зрабіў разам з кінадраматургам Інай Веткінай, з якой яны былі ў той час суседзямі па доме, — напрыклад, сцэнарый фільма «Пра Чырвоную Шапачку» творчаму тандэму ўдалося напісаць усяго за два тыдні.
- Бронзавы ключык Бураціна, пафарбаваны «пад золата», пасля завяршэння здымак рэжысёр выкупіў у студыі за 30 рублёў.
- У адной са сцэн «Чырвонай Шапачкі» галоўная гераіня весела бегае пад праліўным дажджом. «Праліваллі» яго з машыны, якая чэрпала ваду з возера, а на вуліцы ў гэты дзень была нулявая тэмпература... У выніку Яна Паплаўская і яе партнёр, Паляўнічы — Ралан Быкаў, абодва захварэлі на запаленне лёгкіх.
- Славутыя дарослыя акцёры з задавальненнем пагаджаліся на «несур'ёзныя» ролі ў дзіцячых фільмах Нячаева. Напрыклад, Мікалай Трафімаў, які сыграў не толькі Тоўстага Ваўка ў «Чырвонай Шапачцы», але і сабаку Максімільяна ў «Рыжым, сумленным, закаханым», потым пісаў рэжысёру: «Я твой верны сабака, я твой жудасны воўк, я твой абсалютны раб — люблю і веру...»
- Толькі некаторыя дзеці — героі нячаеўскіх казак абралі кіно і тэатр у якасці дарослай прафесіі — напрыклад, Дзяніс Зайцаў, які сыграў лісяня Людвіга ў «Рыжым, сумленным, закаханым», служыць у Санкт-Пецярбургскім тэатры камедыі і здымаецца ў кіно, сёстры-блізняты Ксенія і Паліна Куцепавы іграюць у тэатры «Майстэрня Пятра Фаменкі» і таксама шмат здымаюцца, Бураціна Дзяніс Іосіфаў — вядомы акцёр і рэжысёр кіно.

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.05** Зона Х (16+).
**9.10, 22.05 Серыял «След» (16+).**
**10.45** Дзень у вялікім горадзе.
**11.45, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Меладрама «Сядзелка» (16+).**
**14.00** «Здорава здаровым быць!» (6+)
**14.45, 15.25 Меладрама «Аддай маю мару» (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.50** «На кантролі Прэзідэнта».
**23.45** Сфера інтарэсаў.
**0.25** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 18.20** Тэлебарометр.
**9.05, 20.15 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.00, 23.05** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**10.55, 18.25 «Опер на выкліку». Серыял (16+).**
**12.45, 0.05 Серыял «Самара-2» (16+).**
**13.35** «Свет навыварат. Бразілія» (16+).
**14.55** М/с «Чарапашкі-ніндзя» (12+).
**15.40** Нічога сабе ньюз (12+).
**15.45** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект (12+).
**16.25 «Не нарадзіся прыгожай». Серыял (12+).**
**17.20** «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**21.15** «Супержонка» (16+).
**22.05** «Трэці лішні» (16+) [СЦ].

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 14.45** «Беларуская кухня». Аўсяны кісель.
**8.05, 12.00, 20.15** Навіны культуры.
**8.25, 12.15, 20.35** «Гэты дзень».
**8.30, 21.05 «Доктар Жывага». Маст. фільм. 2-я серыя (16+).**
**9.20, 21.55** «Хроніка Мінскага гета». Фільм другі «За гонар і свабоду» (12+).
**10.15, 16.10 «Апошні бой маэра Пугачова». Маст. фільм. 3-я і 4-я, заключная, серыі (16+).**
**12.20, 17.50** «Апошні дзень». Юрый Гуляеў (12+).
**13.00, 18.25 «Мой ласкавы і пяшчотны звер». Маст. фільм (12+).**
**15.15** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**15.40** «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака». Аляксандр Грышкевіч.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.45** «Фарбы памяці. Лазар Ран».

## Беларусь 5

*Тэхнічная прафілактыка.*
**15.00** Спорт-кадр.
**15.35** Хакей. КХЛ. СКА (Санкт-Пецярбург) — «Дынама» (Мінск).
**17.30** Біятлон. Кубак свету. Паклюка.
**21.20** Спорт-цэнтр.
**21.30** Слэм-данк.
**22.00** Агнявы рубеж.
**22.35** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Вест Хэм» — «Ліверпуль». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

## АНТ

**6.00, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**7.00** [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
**9.10** «Тэорыя змовы» (16+).
**9.55** «Жыць здорава!» (16+)
**11.10 Серыял «І ўсё-ткі я кахаю...» (16+)**
**12.10** «Модны прыгавор» (6+).
**13.10 Серыял «Прыгажуня» (16+).**
**15.05** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20, 0.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20, 23.10** «На самай справе» (16+).
**19.00** «Аб'ектыўна».
**20.00** Час.

## СТБ

**6.00, 6.40,7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 23.00** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40 «Меч-2». Серыял (16+).**
**12.20** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.35, 21.15, 23.45** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 0.30** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**14.35** «Як уладкаваны свет» (16+).
**15.30, 16.50 «Важняк. Гульня на вылет». Серыял (16+).**
**20.00, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Міншчына».
**20.30** «У абстаноўцы міру».
**22.00** «Глядзець усім!» (16+)

## МІР

**6.00** «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).
**6.30 Маст. фільм «Бестселер па каханні» (12+).**



**8.30, 10.10 Серыял «Праменьчык». 1—4-я серыі (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.45** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 19.25 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.55** «Гульня ў кіно» (12+).
**21.15** «Сусветныя гульні розуму» (0+).
**21.50 Серыял «Участковы» (12+).**
**0.00** «Гульня ў праўду» (16+).
**1.00** «Сямейныя гісторыі» (16+).
**1.55** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**2.25** «Водпуск без пуцёўкі» (16+).
**3.15** Канцэрт (16+).
**4.55** «Мая-твая ежа» (16+).
**5.20** «Здароўе» (16+).

## РТР—Беларусь

**7.00** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.25** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.35** «Лёс чалавека» (12+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.25** «У людзях».
**15.00 Серыял «Тайны следства».**
**17.25** «60 хвілін».
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.40 Серыял «Прыгонная» (12+).**
**22.15, 23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15** Спорт-мікс.
**6.25** «50 рэцэптаў першага» (12+).
**7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**7.10** «Здароўе» (12+).
**8.20, 10.20 Серыял «ППС» (16+).**
**9.35, 21.55** «НЗ.by».
**10.40 Серыял «Шлюбны кантракт» (16+).**
**12.30** «Зразумець і абясшкодзіць» (12+).
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00** Пракурорская праверка (16+).
**15.05, 17.05 Баявік «Марскія д'яблы» (16+).**
**16.25, 19.40, 23.05** Сёння. Галоўнае.
**18.00** «ДНК» (16+).
**19.55 Дэтэктыў «Пёс» (16+).**
**20.55, 22.15 Дэтэктыў «Неўскі» (16+).**
**23.20 Серыял «Адысея сышчыка Гурава» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 15.10, 18.55, 21.05, 1.05** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 15.20** М/с «Чып і Дэйл спяшаюцца на дапамогу».
**7.30, 15.15** «Гумарынка».
**7.35 Драма «Кіроўца для Веры» (16+).**
**9.30, 19.00 Драма «Ардынатар» (16+).**
**10.15** Дак. серыял «Вялікі скачок».
**10.45 Меладрама «Шлюбная гісторыя» (16+).**
**13.00, 19.50 Серыял «Дублінскія забойствы» (16+).**
**14.10 Серыял «Вялікая імператрыца» (12+).**
**16.30 Серыял «Агент Мак Гайвер» (16+).**
**17.20 Камедыя «Элвін і бурундукі» (0+).**
**20.55** «Вечарніца».
**21.10 Камедыя «Грэцкі арэшак» (16+).**
**22.40 Трылер «Помста паўшых» (12+).**



## ВТБ

**6.05** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.20** «Лаві момант» (16+).
**8.35** «Ералаш» (6+).
**9.00** М/ф «Тры каты» (0+).
**9.20** М/ф «Качыныя гісторыі» (0+).
**9.40** М/ф «Цімон і Пумба» (0+).
**10.15** Трылер «Золата» (16+).



**12.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь» (16+).
**12.55** Серыял «#СеняФедзя» (16+).
**14.30** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**15.30** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**16.30** Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
**17.30** Серыял «Бамбізы» (16+).
**20.00** «Справа была вечарам» (16+).
**21.00** Трылер «Сноўдэн» (16+).
**23.30** «Уральскія пельмені» (16+).
**0.00** Баявік «Джон Уік-2» (18 +).
**2.15** «Кіно ў дэталях» (16+).
**3.10** Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).
**4.30** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.00** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Масква армянская.
**7.05** «Правілы жыцця».
**7.35, 13.40** «Кельты: кроў і жалеза». Дак. фільм.
**8.35** «Маналогі вялікага Дуні». Дак. серыял. Фільм 4-ы, заключны [СЦ].
**9.05** «Раскол». Серыял (16+) [СЦ].
**10.15** «Назіральнік» [СЦ].
**11.15** Шэдэўры старога кіно. «Сувораў». Маст. фільм.
**13.00** «Анатоль Галаўня». Дак. фільм.
**14.30** Салісты XXI стагоддзя. Дзэніс Родзькін.
**15.10** «Пісьмы з правінцыі» [СЦ].
**15.40** Экранізацыі твораў А. П. Чэхава. «Кветкі запозненыя». Маст. фільм.
**17.15** Дырыжоры XXI стагоддзя. Андрыс Нэлсанс і Каралеўскі аркестр Канцэртгебау.
**19.00** Смеханастальгія.
**19.45** Да 85-годдзя Яўгена Велехава. «Лінія жыцця».
**20.45, 2.05** «Шукальнікі».
**21.35** «Сябар мой, Колька!..» Маст. фільм.
**23.20** «2 Вернік 2».
**0.10** «Культ кіно». «Вясна, лета, восень, зіма... і зноў вясна». Маст. фільм (18+).
**2.50** «Цудоўны Гоша». М/ф для дарослых.

## Настальгія

**6.00** «Спяем, сябры!» з Наталляй Казялковай. 2004 год (12+).
**7.00, 1.10** Маст. фільм «Дом ля кальцавой дарогі» (16+).
**8.40, 9.45, 11.00, 14.00, 15.45, 17.00, 21.45, 23.00, 0.40, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00** Тэлеспектакль «Дарога на Чатанугу». П'еса Віктара Славіна. 1992 год (12+).
**18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1978-ы. 2-я частка. 2008 год (12+).
**19.05** Маст. фільм «Таня» (12+).
**22.00** «Колба часу» (16+).
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім. 2007 год (16+).
**2.40** Кінаканцэрт «Спявае Андрэй Міронаў». 1988 год (12+).

## EuroSport 1

**1.05** Веласпорт. Мальёрка (12+).
**1.25, 4.30, 6.30, 11.15, 14.30** Тэніс. «Гейм, Шэт і Матс» (6+).
**2.00, 7.00, 11.30, 19.05** Тэніс. Australian Open (6+).
**5.00, 15.55** Снукер. German Masters (6+).
**15.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. (12+).
**22.15** Лёгкая атлетыка. World Indoor tour (6+).

## Кінакамедыя

**0.55** Закону тут не месца (12+).
**2.35** 100 мільёнаў еўра (16+).
**4.15** Ажаніся са мною, чувак (18+).
**6.00** Усё ці нічога (16+).
**7.45** Днюха (16+).
**9.35** Тачка на мільён (18+).
**11.50** Твой выхад, дзетка! (18+)
**13.40** Галівудскія копы (12+).
**16.00** Шафер напракат (18+).



**17.55** Дзюплекс (12+).
**19.30** Шэф (12+).
**21.10** Усё магу (16+).
**22.45** Дрэнны Санта-2 (16+).

## ТБ3

**6.00** Дакументальная калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**7.00** М/ф (6+).
**8.10** «Вой, ма-мач-кі». Серыял (12+).
**10.00, 4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
**11.00, 18.20** «Сляпая» (16+).
**12.05** «Варажбітка» (12+).
**13.15, 17.15** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.20** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**15.25** «Мой герой» (12+).
**16.15, 3.15** «Знакі лёсу» (16+).
**19.30** «Чалавек-невідзімка» (16+).
**20.35, 2.25** «Гучныя справы» (16+).
**21.40** «Мы — Мілеры». Камедыя.
**23.50** «Ілюзія палёту». Баявік.
**1.40** «90-я» (16+).

## ТБ1000

**6.10, 18.30** У гасцях у Эліс (16+).
**7.55** Прадчуванне (16+).
**9.35** Аблічча ў натоўпе (16+).
**11.25** Супер Брыс (16+).
**13.05** Сямейнае рабаванне (16+).
**14.40** Не гледзячы ні на што (16+).
**16.40** Д'ябал і Дэніэл Уэбстэр (16+).
**20.10** З любоўю, Розі (16+).
**22.00** Санктум (16+).
**23.55** Рэальныя ваўкалакі (16+).
**1.45** Апантанасць (18+).
**3.55** Ілюзія падману (12+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.55** Царэўна-жабка (6+).
**7.50** Уцякачкі (12+).
**9.45** Ты ў мяне адна (16+).
**11.30** Сведкі (16+).
**13.30** Павук (16+).
**15.25** Горка! (16+)
**17.15** Горка!-2 (16+)
**19.00** Самы лепшы дзень (16+).
**20.55** Асаблівасці нацыянальнага палявання (16+).
**22.40** Асаблівасці нацыянальнай рыбалкі (16+).
**0.30** Асаблівасці нацыянальнага палявання ў зімовы перыяд (16+).
**1.55** Дзень радыё (16+).
**3.50** 30 спатканняў (16+).
**5.30** Чорная курыца, або Падземныя жыхары (6+).

## National Geographic

**6.00** Як перамагаць ва ўсім (16+).
**6.25** Служба выратавання Аляскі (16+).
**7.15, 12.00, 2.55** Аўта-SOS (16+).
**8.00** Дзікі тунец (16+).
**8.50** Золата Юкана (16+).
**9.40, 15.05, 18.10, 21.20, 4.25** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**10.30** Ледзяная дарога (16+).
**12.45, 3.40** Машыны: разбурыць і прадаць (16+).
**13.35** Інстынкт выжывання (16+).
**14.20** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**16.40, 22.10** Сведкі катастроф (16+).
**17.25** Шандун: краіна Канфуцыя (16+).
**19.00, 22.55, 2.05** Варожая планета (16+).
**19.45, 23.45** Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
**20.35** Экстрэмальнае падарожжа (16+).
**0.35** Нацыянальныя святы (16+).
**1.20** Рэальнае паранармальнае (16+).
**5.10** Бітва калекцыянераў (16+).

## Discovery

**8.00, 20.40, 3.30** Аляска: сям'я з лесу (16+).
**8.50, 15.40, 22.20** Махінатары (12+).
**9.40, 16.30, 21.55, 5.00** Як гэта ўстроена? (12+)
**10.30, 18.10, 2.40** Мяцежны гараж (16+).
**11.20, 17.20, 23.10** Паляўнічыя на рэліквіі (16+).
**12.15** Зорнае выжыванне з Беарам Грылсам (16+).
**13.05, 7.15** Залатая ліхаманка (16+).
**14.50** Невытлумачальнае і нявывучанае (12+).
**19.00, 4.15** Склады: бітва ў Канадзе (16+).
**19.50, 5.45** Лабараторыя выбуховых ідэй (16+).
**21.30** Ручная работа (12+).
**0.00** Рака забыцця (16+).
**0.55** Аляска: апошні рубеж (16+).
**1.50** Беар Грылс: выправабаванне страхам (16+).
**6.30** Востраў з Беарам Грылсам (16+).

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15** Зона Х (16+).
**9.10 Серыял «След» (16+).**
**10.45** Дзень у вялікім горадзе.
**11.45, 12.10, 13.05, 18.45, 19.20 Меладрама «Сядзелка» (16+).**
**14.00** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**14.45, 15.25 Меладрама «Аддай маю мару». Заключныя серыі (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Сэнс жыцця (12+).
**17.30** Маршрут пабудаваны (12+).
**21.00** Панарама.
**21.50** Клуб рэдактараў (16+).
**22.30 Меладрама «Вясёлка ў паднябессі». 1-я і 2-я серыі (12+).**
**2.00** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 18.20** Тэлебарометр.
**9.05, 20.10 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.00** «Чалавек-невідзімка» (16+).
**11.00, 18.25 «Опер па выкліку». Серыял (16+).**
**12.40 Серыял «Самара-2» (16+).**
**13.35** «ЖаннаПажані» (16+).
**14.30** М/с «Чарапашкі-ніндзя» (12+).
**15.40** Нічога сабе ньюз (12+).
**15.45** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект (12+).
**16.25 «Не нарадзіся прыгожай». Серыял (12+).**
**17.20** «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**21.15 Баявік «Заложніца-2» (16+).**
**22.55 Драма «Вырататаваць радавога Раяна» (16+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Рыбныя клёцкі.
**8.05, 12.00, 20.15** Навіны культуры.
**8.25, 12.20, 20.35** «Гэты дзень».
**8.30, 21.05 «Доктар Жывага». Маст. фільм. 4-я серыя (16+).**
**9.20, 21.55** «Хроніка Мінскага гета». Фільм чацвёрты «Зондэргета» (12+).
**10.10, 16.30 «Каманда 8». Маст. фільм. 3-я і 4-я, заключная, серыі (16+).**
**12.25, 18.20** «Апошні дзень». Алег Папоў (12+).
**13.00, 18.55 «Чырвоная палатка». Маст. фільм. 2-я серыя (12+).**
**14.25** «Сіла веры».
**14.50** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**15.15** «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака». Дынастыя Сумаравых.
**15.45** «Артэфакты». Лісты Яна Баршчэўскага.
**16.10** «На вышыні». Музыкант Міхаіл Маркаў.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.50** Гала-канцэрт да 90-годдзя з дня нараджэння кампазітара, народнага артыста СССР Югена Глебава.

## Беларусь 5

**7.00, 14.05** Азбука спорту.
**7.10** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы.
**9.55** Хакей. КХЛ. «Аўтамабіліст» (Екацярынбург) — «Дынама» (Мінск).
**11.55, 19.00** «Вось гэта спорт!»
**12.05** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Юнацтва» (Мінск) — «Нёман» (Гродна).
**14.15** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Адвольная праграма.
**18.00** Авертайм.
**18.30** Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.
**19.10** Хакей для ўсіх.
**19.40** Спорт-цэнтр.
**19.50** На шляху да «Токіа-2020». Відэачасопіс.
**20.20** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы. Танцы на лёдзе. Адвольная праграма.

## АНТ

**6.00, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**7.00** [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
**9.10** «Тэорыя змовы» (16+).
**9.55** «Жыць здарова!» (16+)
**11.10 Серыял «І ўсё-ткі я кахаю...» (16+)**
**12.10** «Модны прыгавор» (6+).
**13.10 Маст. фільм «Правілы геймера» (6+).**
**15.05** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20, 1.50** «Трывожная кнопка» (16+).
**16.40** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.35, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Поле цудаў» (16+).
**20.00** Час.
**21.10** Усе на юбілеі Леаніда Агуціна. Частка 1-я (12+).
**23.10 Маст. фільм «Марная ахвяра» (16+).**
**0.55** «Пра каханне» (16+).

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 23.00** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40 «Меч-2». Серыял (16+).**
**12.20** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.40, 21.25, 23.45** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**13.50, 16.50** «Экстранны выклік».
**14.00, 0.30** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**14.55, 22.15** «Глядзець усім!» (16+)
**15.20, 17.00 «Важняк. Гульня на вылет». Серыял (16+).**
**20.00, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Міншчына».
**20.30** «Тайны Беларусі».

## МІР

**6.00** «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).
**7.05 Маст. фільм «Беражыце мужчын» (6+).**
**8.45, 10.20 Серыял «Тры паўграцы». 1—4-я серыі (12+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.45** Навіны (бягучы радок).
**10.10** «У гасцях у лічбы» (16+).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Прыгавор!?» (16+)
**17.20 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**18.20** «Сусветныя гульні розуму» (0+).
**19.25** «Гульня ў кіно» (12+).
**20.25 Маст. фільм «Жорсткі раманс» (12+).**
**23.05** «Начны экспрэс» (12+).
**0.15** «Гуляй, дутар!» (12+)
**0.45** «Трымайся, шоўбіз!» (16+)
**1.20 Серыял «Толькі не адпускай мяне» (16+).**
**4.40 Маст. фільм «Белы Клык» (0+).**

## РТР—Беларусь

**7.00** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.25** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.35** «Лёс чалавека» (12+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.20** «У людзях».
**15.00 Серыял «Тайны следства».**
**17.25** «60 хвілін».
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.50** «Гумарына» (16+).
**23.10 Маст. фільм «Лёд, які не растае» (12+).**

## НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15** Спорт-мікс.
**6.25** «50 рэцэптаў першага» (12+).
**7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**7.10** «Здароўе» (12+).
**8.20, 10.20 Серыял «ППС» (16+).**
**9.35** «НЗ.by».
**10.40 Серыял «Шлюбны кантракт» (16+).**
**12.30** «Зразумець і абясшкодзіць» (12+).
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00** Пракурорская праверка. (16+).
**15.05, 17.05 Баявік «Марскія д'яблы» (16+).**
**16.25, 19.40, 23.35** Сёння. Галоўнае.
**18.00** «ДНК» (16+).
**19.55** «Экспертыза злачынстваў» (16+).
**20.25, 22.45, 23.50 Дэтэктыў «Неўскі» (16+).**
**22.15** «НЗ.by: час вынікаў».

## 8 канал

**7.00, 15.55, 20.00, 21.05, 1.00** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 16.05** М/с «Чып і Дэйл спяшаюцца на дапамогу».
**7.30, 16.00** «Гумарынка».
**7.35, 23.10 Баявік «Ціхаакіянскі рубеж» (12+).**
**9.45, 20.05 Драма «Ардынатар» (16+).**
**10.30** Дак. серыял «Вялікі скачок».
**11.00 Трылер «Дэжавю» (16+).**
**13.00, 18.25 Серыял «Унутры» (16+).**
**14.45 Серыял «Вялікая імператрыца» (12+).**
**17.40 Серыял «Агент Мак Гайвер» (16+).**
**20.55** «Вечарніца».



## ВТБ

**6.05** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.20** «Лаві момант» (16+).
**8.35** «Ералаш» (6+).
**9.00** «Тры каты» (0+).
**9.20** М/ф «Качыныя гісторыі» (0+).
**9.40** М/ф «Цімон і Пумба» (0+).
**10.15** Баявік «Даспехі Бога-2» (12+).
**12.25** Скетч-шоу «Даеш моладзь» (16+).
**13.25, 18.30** Серыял «#СеняФедзя» (16+).
**14.30, 1.30** Серыял «Выжыць пасля» (16+).
**16.30** Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
**17.30, 23.40** «Уральскія пельмені» (16+).
**20.00** Серыял «Бамбізы» (16+).
**21.00** Баявік «Капітан Філіпс» (16+).
**0.35** Серыял «Цацкі» (16+).
**3.10** Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).
**4.30** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Масква чайная.
**7.05, 20.05** «Правілы жыцця».
**7.35, 13.40, 20.45** «Кельты: кроў і жалеза». Дак. фільм.
**8.35, 23.10** «Маналогі вялікага Дуні». Дак. серыял [СЦ].
**9.05, 22.20** «Раскол». Серыял (16+) [СЦ].
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 1.40** ХХ стагоддзе. «Майстры мастацтваў. Народны артыст СССР Алег Барысаў».
**12.20, 18.40, 0.55** «Што рабіць?»
**13.10** «Адлюстраваны час». Дак. серыял.
**14.30** Салісты ХХІ стагоддзя. Аляксей Няклюдаў.
**15.10** Навіны. Падрабязна. Кіно.
**15.20** Біблейскі сюжэт.
**15.50** «Саці. Нясумная класіка...»
**16.35** Экранізацыі твораў А. П. Чэхава. «Валодзя вялікі, Валодзя маленькі». Маст. фільм.
**17.40** Дырыжоры ХХІ стагоддзя. Антоніа Папана і Саксонская дзяржаўная капэла Дрэздэна.
**19.45** Галоўная роля.
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**21.40** «Абсалютны слых».
**0.00** 75 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Гутмана. Майстар-клас.
**2.50** Колер часу. Васіль Паленаў.

## Настальгія

**6.00** Дак. фільм «Аўтапартрэт». Уладзімір Высоцкі. 1987 год (16+).
**6.40, 8.40, 9.45, 11.00, 12.40, 15.45, 17.00, 20.40, 21.45, 23.00, 1.35, 3.45** Музычная настальгія (12+).
**7.20, 13.10, 19.00** Маст. фільм «Дом ля кальцавой дарогі» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00** «Нараджаныя ў СССР» (12+).
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім. 2007 год (16+).
**14.40** Кінаканцэрт «Спявае Андрэй Міронаў». 1988 год (12+).
**18.00** «Спяем, сябры!» з Наталляй Казялковай. 2004 год (12+).
**0.00** «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. 2005 год (12+).
**0.55** Маст. фільм «Колер белага снегу» (16+).
**1.50** «Тэатральныя сустрэчы». «Непрыдуманыя гісторыі. Забаўны выпадак». 1992 год (16+).
**3.55** «Гісторыя каня». Спектакль Ленінградскага БДТ. 1989 год (16+).

## EuroSport 1

**0.05** Веласпорт. «Вуэльта Сан-Хуана» (12+).
**2.30, 11.30, 21.10, 22.25** Тэніс. Australian Open (6+).
**11.15, 13.30, 23.30** Тэніс. «Гейм, Шэт і Матч» (6+).
**14.00, 20.00** Горныя лыжы. Кубак свету (12+).
**14.55** Снукер. European Masters (6+).
**15.55** Снукер. German Masters (6+).
**19.00** Веласпорт (трэк). Шэсць дзён Берліна (12+).

## Кінакамедыя

**0.00** Днюха (16+).
**1.50** Высокі бландзін у чорным чаравіку (12+).
**3.55** Фанаткі на сняданак не застаюцца (16+).
**5.50** Тачка на мільён (18+).
**8.05** Твой выхад, дзетка! (18+)
**10.00** Шафер напракат (18+).
**11.55** Да чорта на рогі (16+).
**13.40** Закону тут не месца (12+).
**15.30** Галівудскія копы (12+).
**17.45** Дрэнны Санта-2 (16+).
**19.30** Дзюплекс (12+).
**21.05** Маё вялікае грэчаскае лета (16+).
**22.55** Пяты элемент (12+).

## ТБ3

**6.00** Дакументальная калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**6.40** М/ф (6+).
**7.20** «Школа доктара Камароўскага» (6+).
**7.50** «Доктар І...» (16+)
**8.20** «Вой, ма-мач-кі». Серыял (12+).
**10.10, 15.25, 4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
**11.10, 18.30** «Сляпая» (16+).
**12.15, 19.40** «Варажбіткa» (12+).
**13.20, 17.25, 3.10** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.20, 2.40** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**16.25, 4.00** «Знакі лёсу» (16+).
**20.50** «Падмані мяне». Серыял (16+).
**22.40** «Лінія абароны» (16+).
**23.15** «10 самых» (16+).
**23.50** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**0.35** «Пяты элемент». Баявік (16+).

## ТБ1000

**6.10, 18.25** Солт (16+).
**8.10** Неверагоднае падарожжа містара Співета (6+).
**10.15** Ілюзія падману (12+).



**12.20** Ілюзія падману-2 (12+).
**14.30** «Лінкальн» для адваката (16+).
**16.35** Зоны цемры (16+).
**20.10** Тайнае акно (12+).
**21.50** Гадзіла (12+).
**0.15** Восень у Нью-Ёрку (12+).
**2.15** Кола цудаў (16+).
**4.05** Візантыя (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**7.05** Ленін. Непазбежнасць (16+).
**9.35** Дзень радыё (16+).
**11.30** Бумер-2 (16+).
**13.35, 19.00** Павук (16+).
**15.30** Казка пра рыбака і рыбку (6+).
**16.00** Русалка. Возера мёртвых (16+).
**17.35** Унук касманаўта (12+).
**20.55, 5.30** Зязюля (16+).
**22.45** Гумарыст (16+).
**0.35** Сабібор (12+).
**2.35** Герой (12+).
**4.00** Глухар у кіно (16+).

## National Geographic

**5.55** Як перамагаць ва ўсім (16+).
**6.45** Служба выратавання Аляскі (16+).
**7.30, 12.05, 1.55** Аўта-SOS (16+).
**8.15, 18.10, 22.05, 1.10, 3.30** Дзікі тунец (16+).
**9.00** Золата Юкана (16+).
**9.45** Гісторыі выратавання (16+).
**10.30** Ледзяная дарога (16+).
**12.50, 2.45** Машыны: разабраць і прадаць (16+).
**13.35** Інстынкт выжывання (16+).
**14.20** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**15.10, 20.30, 4.20** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**16.40, 21.20** Сведкі катастроф (16+).
**17.25** Кітайская мегабудоўля (16+).
**19.45** Экстрэмальнае падарожжа (16+).
**22.50** Каралі рыбалкі (16+).
**23.40** Мегамасты (16+).
**0.25** Рэальнае паранармальнае (16+).
**5.10** Рабі стаўкі і ўзрывай (16+).

## Discovery

**8.00, 20.40, 3.30** Аляска: сям'я з лесу (16+).
**8.50, 15.40, 22.20** Махінатары (12+).
**9.40, 16.30, 21.30, 5.00** Як гэта ўстроена? (12+)
**10.05** Ручная работа (12+).
**10.30, 18.10, 2.40** Мяцежны гараж (16+).
**11.20, 17.20, 23.10** Паляўнічыя на рэліквіі (16+).
**12.15, 1.50** Зорнае выжыванне з Беарам Грылсам (16+).
**13.05** Чалавек супраць мядзведзя (12+).
**13.55** Стальныя хлопцы (12+).
**14.50** Паляўнічы на цацкі (12+).
**19.00, 4.15** Склады: бітва ў Канадзе (16+).
**19.50, 5.45** Лабараторыя выбуховых ідэй (16+).
**0.00** Дальнабойшчык у Амерыцы (12+).
**0.55** Экспедыцыя Мунга (16+).
**6.30** Востраў з Беарам Грылсам (16+).
**7.15** Сакрэтныя базы нацыстаў (12+).

# УСЕ ПЫТАННІ — НЯПРОСТЫЯ

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ у сераду, 22 студзеня, правёў асабісты прыём грамадзян.**


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Пераважная большасць зваротаў у гэты дзень (за выключэннем аднаго) была далёка не па профілі камісіі, якую ўзначальвае Сяргей Анатолевіч. Датычыліся яны пэўных складаных жыццёвых сітуацый, у якіх з прычыны аб'ектыўных і суб'ектыўных абставін апынуліся людзі. Сяргей Рачкоў унікаў у сутнасць праблемы кожнага свайго суразмоўцы, імкнуўся зразумець яго хваляванні, турботы, клопаты і па магчымасці адшукаць алгарытм іх вырашэння ці мінімізацыі наступстваў.

> З простымі пытаннямі ў Савет Рэспублікі не звяртаюцца. Таму задача сенатараў — уважліва выслухаць і пачуць людзей, паглядзець, што можна зрабіць для абароны іх правоў, прычым кожнага, хто папрасіў дапамогі.

Першыя два наведвальнікі, паводле іх слоў, сталі ахвярамі ашуканцаў і аферыстаў. Першы з іх «дапамогай» набыў такі легкавы аўтамабіль, што цяпер не можа з-за абмежаванняў праваахоўных органаў ад'ехаць на сотню метраў ад пад'езда свайго дома ў Мінску. Нельга! Забараняецца выкарыстоўваць машыну. Хоць за гэту патрыманую іншамарку 2001 года выпуску заплаціў восем тысяч рублёў, здзелку аформіў у адпаведнасці з правіламі і заканадаўствам Беларусі. Што і казаць, непрыемная гісторыя.

Сяргей Рачкоў прапанаваў яшчэ раз звярнуцца ва Ўпраўленне Следчага камітэта па Мінску і Міністэрства ўнутраных спраў і з іх удзелам вырашыць нарэшце праблему. А тым часам у Савеце Рэспублікі зварот небаракі-аўтааматара возьмуць на кантроль. Наведвальнік пагадзіўся з такім варыянтам.

А вось Іван Іванавіч, аўтар другога звароту, трапіў таксама ў вельмі непрыемную гісторыю. А пачыналася яна прыгожа і нават рамантычна. Аднойчы штотыднёвіку для пажылых людзей, дзе друкуюцца душэўныя гісторыі, дачныя сакрэты, юрыдычная кансультацыя, парады спецыялістаў па медыцыне, прачытаў пранікнёны ліст незнаёмай жанчыны. І нешта яго кранула за жывое. Настолькі моцна, што ён адшукаў яго аўтарку. Пазнаёміліся, спадабаліся адно аднаму. У рэшце рэшт сталі жыць разам, пажаніліся.

Іван Іванавіч як чалавек нябедны вырашыў набыць двухпакаёўку ў Магілёве. Каханая пераканала ў тым, што жыць будзе лепш у Мінску — сталіца ж. Той пагадзіўся. А далей праз пэўны тэрмін... Не будзем пераказваць усе перыпетыі гэтай вельмі асабістай гісторыі, скажам толькі, што сумеснае жыццё не заладзілася. Сумна, але такіх гісторый процьма. Людзі і з багатым жыццёвым досведам разыходзяцца.

Усё б нічога, толькі вось Іван Іванавіч у выніку пэўных маніпуляцый з боку яго былой палавінкі, згодна з яго заявай, застаўся без двухпакаёвай кватэры. Сёння ён моцна шкадуе, што некалі паддаўся на пяшчотныя ўгаворы перапісаць жыллё на яе. Пасля гэтага адносіны пачалі рэзка пагаршацца.

Зразумела, Іван Іванавіч звярнуўся куды трэба: у міліцыю, пракуратуру, суд. Але пытанне не вырашаецца, больш таго, яму паведамляюць з інстанцый, што няма падстаў для ўзбуджэння крымінальнай справы. Не верыць у ашуканства. Адсюль і просьба да Сяргея Рачкова: дапамагчы прабіць сцяну непаразумення з боку праваахоўных органаў.

Пытанне сапраўды складанае, лічыць Сяргей Рачкоў. Але Івану Іванавічу паабяцалі садзейнічанне ў межах заканадаўства.

Іншы наведвальнік прыйшоў з канкрэтнымі прапановамі па супрацьдзеянні небяспечным зменам клімату на планеце і выратаванні людзей ад наступстваў патуповага пацяплення. Уладзімір Пятровіч ужо звяртаўся і ў Нацыянальную акадэмію Беларусі, і да расійскіх акадэмікаў. Але дарэмна. Ужо назбіраўся чамадан адказаў. Не разумеюць яго падыходаў.

Тым не менш Уладзімір Пятровіч не губляе аптымізму. Таму і запісаўся на прыём да Сяргея Рачкова як да аўтарытэтнага спецыяліста ў міжнародных справах. Бо гэта праблема сусветнага маштабу і патрабуе адпаведных глабальных намаганняў, лічыць заяўнік.

Сяргей Рачкоў у размове з журналістамі па выніках прыёму адзначыў, што з простымі пытаннямі ў Савет Рэспублікі не звяртаюцца. Таму задача сенатараў — уважліва выслухаць і пачуць людзей, паглядзець, што можна зрабіць для абароны іх правоў, прычым кожнага, хто папрасіў дапамогі. А пры неабходнасці — звярнуцца ў адпаведныя органы ўлады, каб паспрабаваць знайсці ці акрэсліць шляхі вырашэння праблемы.

**Леанід ТУГАРЫН.**

❍ У тэму

## Зарплата і занятасць

**Член Прэзідыума Савета Рэспублікі Сяргей РАЧКОЎ у рамках правядзення адзіных дзён інфармавання наведаў дзіцячую бальніцу УАЗ «Маладзечанская ЦРБ».**

На сустрэчы старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы з калектывам абмяркоўваліся пытанні занятасці і заработнай платы, мерапрыемствы па барацьбе з карупцыяй.

Акрамя таго, Сяргей Рачкоў расказаў пра асноўныя кірункі дзейнасці Савета Рэспублікі і Пастаяннай профільнай камісіі, якую ён узначальвае.



БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# РАБОТА ЁСЦЬ. ШТО ЯШЧЭ ТРЭБА?

### Самы важны кірунак дзейнасці выканаўчай улады на месцах — гэта стварэнне ўмоў для рэалізацыі патэнцыялу чалавека

**Такую думку выказаў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ падчас сустрэчы з калектывам прыватнага прадпрыемства «Газасілікатбуд Магілёў», паведамляе БелТА.**


Фота БелТА.

«Самы важны кірунак дзейнасці не толькі для Магілёўскага аблвыканкама, але і для ўсёй выканаўчай улады на месцах — гэта стварэнне ўмоў для рэалізацыі патэнцыялу чалавека. Каб у яго была магчымасць хадзіць на работу, якасна выконваць ускладзеныя на яго функцыі і атрымліваць за гэта добрую плату», — звярнуў увагу Міхаіл Русы.

У Магілёўскай вобласці на 2020 год запланавана шырокая праграма развіцця ўсіх сфер жыцця. Стварэнне новай вытворчасці ў Слаўгарадзе, запуск вытворчасцяў у сферы аграпрамысловага комплексу ў Бялынічах і Крычаве, рэканструкцыя і ўзвядзенне новых медыцынскіх устаноў, стварэнне і мадэрнізацыя спартыўных аб'ектаў.


Фота БелТА.

«З'яўленне вытворчасцяў забяспечыць насельніцтва новымі рабочымі месцамі. Работа ў Магілёўскай вобласці ёсць, пытанне ў тым, якую плату за яе прапануюць. Усе хочуць высокую зарплату, але не ўсе разумеюць, што для гэтага трэба не толькі ўпарта працаваць, але яшчэ і якасна выконваць ускладзеныя функцыі», — падкрэсліў Міхаіл Русы.

На прыкладзе прыватнага прадпрыемства «Газасілікатбуд Магілёў» ён адзначыў, што эфектыўная палітыка кіраўніцтва, камфортныя ўмовы працы, высокая кваліфікацыя супрацоўнікаў робяць вытворчасць паспяховай. Цяпер 80 % прадукцыі экспартуецца ў Расію і Украіну. На прадпрыемстве працуюць 234 чалавекі, у групе кампаній — 350 чалавек. Сярэдняя заработная плата складае амаль 1,3 тысячы рублёў.

«На прадпрыемствах, вытворчасцях, будоўлях і іншых сферах патрэбныя дасведчаныя кіраўнікі, якія змогуць выразна і дакладна ставіць задачу перад супрацоўнікам. Галоўнае — стварыць людзям нармальныя ўмовы не толькі ў працоўным працэсе, але і ў адукацыі, ахове здароўя і іншых сферах», — дадаў старшыня камісіі.

# УЗРОВЕНЬ ПАВІНЕН БЫЦЬ ВЫКЛЮЧНА СУСВЕТНЫ

## У Магілёве медыцынскія эксперты абмеркавалі планы развіцця гэтай галіны на наступную пяцігодку і заклалі сімвалічную капсулу ў падмурак новага кардыялагічнага цэнтра

**СЁННЯ ў краіне будуюцца сучасныя паліклінікі і бальніцы, на ўзбраенні якіх знаходзіцца самае высокатэхналагічнае абсталяванне. Прэзідэнт звяртае ўвагу на тое, што ўсё сучаснае і перадавое павінна знаходзіцца не толькі ў сталіцы, але і максімальна блізка да сельскага жыхара. На гэтым тыдні ў Магілёве адбыўся вялікі медыцынскі савет, у якім узялі ўдзел губернатар вобласці Леанід ЗАЯЦ, намеснік міністра аховы здароўя Вячаслаў ШЫЛА, галоўны кардыёлаг краіны Аляксандр МРОЧАК. Нагодай для сустрэчы стала размова аб развіцці галіны аховы здароўя і эфектыўным выкарыстанні медыцынскіх рэсурсаў у Магілёўскай вобласці. Удзельнікі наведалі найбольш значныя медыцынскія аб'екты абласнога цэнтра.**

Летась у Магілёве ўступіў у строй рэканструяваны радзільны дом. Гэта толькі адзін з карпусоў гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі. У абноўленым раддоме сканцэнтравана вялікая колькасць сучаснай медыцынскай тэхнікі і створаны самыя камфортныя ўмовы для персаналу і парадзіх. Сёлета і налета запланаваны знос усіх старых медпабудоў бальніцы, якім болей чым па 100 гадоў, і будаўніцтва новага сучаснага корпуса. Ён будзе прызначаны для аказання медыцынскай дапамогі пацыентам з нетраўматычнымі пашкоджаннямі галаўнога мозга і цэрэбраваскулярнай паталогіяй.

За апошнія гады значна ўмацавана матэрыяльна-тэхнічная база Магілёўскага абласнога анкадыспансера. Сёння тут на ўліку знаходзіцца 35 тысяч жыхароў рэгіёна, прычым штогод выяўляецца больш за 5 тысяч новых захворванняў. План рэарганізацыі анкаслужбы ў Магілёўскай вобласці быў зацверджаны яшчэ ў 2004 годзе. З 2010 года на базе анкадыспансера пачаў працаваць радыелагічны корпус, што дало пацыентам магчымасць атрымліваць высокатэхналагічнае прамянёвае лячэнне. На працягу 10 гадоў з'явіліся палатны корпус на 120 ложкаў, хоспіс на 30 ложкаў, цэнтралізаваная цыталагічная лабараторыя. У 2017 годзе быў запушчаны новы аперацыйны блок, а ў 2019-м пачаў работу марфалагічны корпус з лабараторыяй для імунагісталагічных даследаванняў. Сёлета запланаваны ўвод лабараторыі радыенукліднай дыягностыкі, для якой Міністэрства аховы здароўя ўжо закупіла сучасную дэтэктарную гама-камеру. Гэтае абсталяванне дазволіць своечасова выяўляць наяўнасць метастаз і пашкоджаных лімфавузлоў пры новаўтварэннях. Дзякуючы набытаму два гады таму спецыяльнаму абсталяванню для відэаасіставанай хірургіі цяпер на базе анкадыспансера робяць эндаскапічныя і таракаскапічныя аперацыі.



Галоўны кардыёлаг краіны Аляксандр МРОЧАК узяў удзел у закладцы сімвалічнага каменя будучага кардыяцэнтра.

Сёння ў мікрараёне Казіміраўка ўзводзіцца суперсучасная «разумная» паліклініка, якая будзе абслугоўваць 37 тысяч дарослага і дзіцячага насельніцтва. На яе базе размесцяцца падстанцыя хуткай медыцынскай дапамогі, жаночая кансультацыя, стаматалагічнае аддзяленне, рэнтгенаддзяленне з дзвюма рэнтгеналагічнымі ўстаноўкамі і мамографам, сучасная клініка-дыягнастычная лабараторыя і шмат чаго іншага. Будзе функцыянаваць электронная база, а вынікі абследавання пацыента адразу ж трапяць на яго электронную амбулаторную карту. Абслугоўванне будзе весціся па праграме «Клапатлівая паліклініка», асноўнай задачай якой з'яўляецца камфортнае абслугоўванне пацыентаў. Сёння аб'ект зроблены прыблізна на 8 %, але, як запэўніў **генеральны дырэктар ААТ «Будтрэст № 12» Дзмітрый МАРОЗАЎ,** паліклініка будзе здадзеная ў эксплуатацыю ўжо сёлета. На яе ўзвядзенне з абласнога бюджэту выдзелена 47 мільёнаў рублёў.



Генеральны дырэктар будтрэста № 12 гарантуе, што новая паліклініка будзе здадзена ўжо сёлета.

Пасля наведвання медыцынскіх аб'ектаў Магілёва на базе абласной бальніцы адбыўся вялікі медыцынскі савет, дзе ўдзельнікі абмеркавалі план аптымізацыі ўпраўлення аховы здароўя Магілёўскай вобласці, мадэрнізацыю сістэмы кардыялагічнай дапамогі, ступень аказання анкалагічнай дапамогі. Анкалагічныя захворванні і хваробы органаў кровазвароту апошнія гады ўпэўнена трымаюць у Магілёўскай вобласці першыя месцы сярод прычын смяротнасці. Прычым калі магілёўскі анкадыспансер за апошні час дастаткова добра перааснасціўся, то кардыяхірургі працуюць у дастаткова напружаных умовах. Але гэта толькі пытанне часу. На базе абласной бальніцы ўжо падрыхтаваная пляцоўка пад узвядзенне сучаснага кардыялагічнага цэнтра, дзе падчас семінара якраз і адбылася закладка сімвалічнай капсулы.

— Будаўніцтва новага будынка дасць магчымасць рабіць аперацыі на яшчэ больш якасным узроўні, — адзначыў падчас гэтага ўрачыстага моманту **дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра кардыялогіі Аляксандр МРОЧАК.** — У свеце ўсё змяняецца, з'яўляюцца новыя тэхналогіі, і мы якраз і абмяркоўвалі іх рэалізацыю ў новым корпусе. Гэта гібрыдная кардыяхірургія, нетрадыцыйная кардыялогія і арытмалогія. Яны дазваляюць рабіць найменш траўматычныя аперацыі і скарачаюць знаходжанне чалавека на бальнічным ложку ў разы. Арганізацыя аказання медыцынскіх паслуг павінна быць такая, каб «залаты стандарт» 120 хвілін быў даступны любому грамадзяніну на любой тэрыторыі. Аказваючы дапамогу пры вострым каранарным сіндроме — а менавіта гэта цяпер найбольш частая кардыялагічная праблема, — трэба ўкласціся ў 120 хвілін, каб даставіць пацыента ў кардыяцэнтр.

— Такая канцэпцыя закладзена па ўсёй краіне, і падобныя цэнтры адкрываюцца не толькі ў гарадах абласнога падпарадкавання, але і ў населеных пунктах з колькасцю насельніцтва 80 тысяч, — дапоўніў калегу **намеснік міністра аховы здароўя Вячаслаў ШЫЛА.** — І гэта датычыцца і іншых відаў спецыялізаванай медыцынскай дапамогі. Усё робіцца для таго, каб наблізіць яе як мага бліжэй да жыхароў сельскай мясцовасці і палепшыць якасць іх абслугоўвання.

— У найбліжэйшыя пяць гадоў вобласць чакаюць вялікія пераўтварэнні, накіраваныя на аказанне прафесійнай медыцынскай дапамогі чалавеку і падаўжэнне яго жыцця ў цэлым, — падкрэсліў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід ЗАЯЦ.** — Гэты цэнтр будзе забяспечваць пацыентаў Магілёўскай вобласці самымі сучаснымі метадамі лячэння. Тут мы ўстановім найноўшае абсталяванне, якое ёсць у свеце. Пераўтварэнні адбудуцца не толькі па кардыяхірургіі, але і па анкакірунку. Мы маем намер пабудаваць новы корпус і аснасціць яго перадавым абсталяваннем. Неабходны вялікія матэрыяльныя сродкі для таго, каб усё запланаванае ажыццявіць. Я вельмі ўдзячны Прэзідэнту краіны, які падтрымаў прапанову Магілёўскага аблвыканкама па развіцці медыцынскай базы, і тым прадпрыемствам, якія адгукнуліся на заклік узяць удзел у зборы сродкаў на будаўніцтва важных для вобласці медыцынскіх аб'ектаў. Гэтыя пералічэнні дапамаглі паспяхова завяршыць рэканструкцыю Магілёўскага раддома і бальніцы ў Асіповічах, а таксама пачаць будаўніцтва паліклінікі ў раёне Казіміраўкі і кардыяхірургічнага цэнтра. Спадзяюся, што мы і далей будзем сумеснымі намаганнямі ствараць у вобласці моцную медыцынскую матэрыяльна-тэхнічную базу, якая зможа аператыўна ратаваць жыцці людзей.



У Магілёве рэалізуецца план рэарганізацыі анкаслужбы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

### Кампетэнтна

**Уладзімір ГАЦКО, член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:**

— Сёння ў парламенце знаходзіцца на разглядзе Закон «Аб ахове здароўя», і вельмі важна адпрацаваць на практыцы тыя аспекты, якія павінны там улічвацца. Мы наведалі ў Магілёве медыцынскія аб'екты, дзе ўведзены ў дзеянне самыя перадавыя тэхналогіі, і пераканаліся, што без іх якаснае і даступнае абслугоўванне насельніцтва ў будучыні проста немагчыма.

# Мадэрнізацыя. Поспех. Дабрабыт

## Як развіваецца завод, дзе самая высокая колькасць працуючых у раёне

**Прадпрыемства «Мастоўдрэў» да 2007 года лічылася амаль што банкрутам. Людзі звальняліся, прадукцыя не вытрымлівала ніякай канкурэнцыі, аб'ёмы вытворчасці катастрафічна падалі. І гэта пры тым, што прадпрыемства было горадаўтваральнае. Стала зразумела, што без падтрымкі дзяржавы галіна не зможа развівацца. У гэты час Прэзідэнтам краіны былі прыняты кардынальныя рашэнні: мадэрнізаваць вытворчасць і заняцца ўласнай перапрацоўкай драўніны.**

Пра гэта расказаў **генеральны дырэктар ААТ «Мастоўдрэў» Сяргей АСОСАЎ** падчас нядаўняй прэс-канферэнцыі ў Мастоўскім раёне. Ён паказаў журналістам усю вытворчасць, якая поўнасцю змянілася за апошнія 10—13 гадоў і абышлася дзяржаве і прадпрыемству ў 200 мільёнаў еўра.

Мы праходзім каля вялікага цэха, дзе вырабляюцца пліты МДФ. Гэты цэх — асаблівы гонар дырэктара, тут робяць прадукцыю, якую не так даўно асвоілі, але з якой ужо ўдала канкурыруюць на знешнім і ўнутраным рынку. Яшчэ адзін знакавы цэх — па выпуску ламінату. Яго таксама вырабляюць адносна нядаўна, але аб'ёмы нарошчваюць, бо ёсць попыт у расійскіх спажыўцоў. А гэта добрая крыніца прытоку валюты ў краіну, што, у сваю чаргу, дазваляе ўдасканальваць умовы працы, павышаць зарплату работнікам.

Многія з тых, хто цяпер працуе, памятаюць іншыя часы. Прадпрыемства доўгі час «ішло на дно». І толькі з дапамогай дзяржавы пачало выходзіць з крызісу. Як адзначыў Сяргей Асосаў, завод не спыняў сваю работу нават падчас экстрэмальнай рэканструкцыі. Кіраўнік завода разумеў, што вельмі важна захаваць працоўны калектыў. І многія, нават у такіх складаных умовах, заставаліся на прадпрыемстве.

— Людзі працавалі пад адкрытым небам, але ішлі да сваёй мэты. Мы стараліся рабіць рэканструкцыю як мага хутчэй, каб прадпрыемства пачало працаваць і людзі адчулі аддачу ад сваёй працы. Так і здарылася, — кажа генеральны дырэктар.

Ён упэўнены, што мясцовыя жыхары — патрыёты сваёй малой радзімы. Менавіта яны складаюць асноўны касцяк работнікаў прадпрыемства. А працуе тут — ні многа ні мала — паўтары тысячы чалавек. Для 15-тысячнага горада гэта сапраўды вельмі значная лічба. Працаздольнага насельніцтва значна менш за 15 тысяч, таму мясцовых кадраў не хапае. Да таго ж патрэба ў спецыялістах вырасла пасля мадэрнізацыі, асабліва гэта датычылася работы аўтаматычных сістэм. З розных навучальных устаноў — сярэдне-спецыяльных і вышэйшых — было прыцягнута 150 маладых спецыялістаў. Яны працуюць на камп'ютарах там, дзе патрэбна адпаведная падрыхтоўка.

— Некаторыя спецыялісты прыйшлі па размеркаванні з універсітэтаў, многія з іх прыжыліся ў нас, завялі свае сем'і, — кажа суразмоўнік. — Вядома, не ўсе застаюцца пасля адпрацоўкі, але тыя, хто застаецца, — гэта сапраўды надзейная каманда. Таксама добры рэзерв — наша мясцовая моладзь. Некаторыя працуюць і вучацца завочна, узначальваюць участкі і нават цэхі. Тут працаваць прэстыжна.

Пра гэта сведчыць і нізкая цякучасць кадраў на заводзе. Як адзначылі ва ўпраўленні працы, занятасці і сацыяльнай абароны насельніцтва Мастоўскага райвыканкама, вакансіі ад прадпрыемства з'яўляюцца даволі рэдка. І гэта зразумела. Сярэдняя зарплата тут 1100 рублёў. На сённяшні дзень патрэбны, напрыклад, кіроўцы пагрузчыкаў і вялікагрузаў, але возьмуць толькі кваліфікаваных спецыялістаў.

Увогуле на прадпрыемстве нават ёсць чарга на вакантныя месцы. Яны ўзнікаюць, калі хто-небудзь звальняецца альбо ідзе на заслужаны адпачынак. З прэтэндэнтамі дырэктар завода сустракаецца падчас асабістага прыёму, які ён праводзіць кожны панядзелак. Але далёка не ўсе маюць шанцы ўладкавацца на работу. Напрыклад, сюды не бяруць тых, хто раней тут працаваў і меў спагнанні ад кіраўніцтва ці наогул быў звольнены за парушэнне працоўнай дысцыпліны. З гэтым тут строга. Кожны дзень работнікі праходзяць агляд, і знаходжанне ў нецвярозым стане недапушчальнае.



— Калі раней за месяц можна было трапіць на 3-4 чалавекі, якія былі ў нецвярозым стане, дык цяпер такога няма. Я асабіста сачу за гэтым, — кажа дырэктар.

Праўда, ёсць на прадпрыемстве і свая спецыфіка. Напрыклад, на фанернай вытворчасці 60 % жанчын, бо работа тут манатонная. І хоць умовы працы не лічацца шкоднымі, але ёсць начныя змены і бягучы графік. Мужчынам такая работа не даспадобы. Але паступова і на гэтай вытворчасці ўсё больш маладых хлопцаў, бо жанчыны, якія дасягаюць пенсійнага ўзросту, ідуць на заслужаны адпачынак.

Дэмаграфічнае выбыванне кампенсуецца больш эфектыўнай тэхнікай. Гэты працэс ідзе пастаянна. Нядаўна на фанерным заводзе замянілі чатыры старыя прэсы адным сучасным японскім, што аблегчыла працу сотні работнікаў.

Нават пры шырокай мадэрнізацыі агульная колькасць супрацоўнікаў не змяншаецца, бо прадпрыемства развіваецца. Дырэктар вядзе да пляцоўкі, дзе сёлета плануецца стварыць лесапільны цэх. Карпусы ўжо стаяць, зроблена добраўпарадкаванне, на гэта пайшло два мільёны рублёў уласных сродкаў. Для работы ў новым цэху будзе створана 20 рабочых месцаў. Яшчэ пяць чалавек плануецца працаўладкаваць на пялетным заводзе. Ён таксама будзе запушчаны сёлета.

**У тэму**

Як паведаміла **намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Мастоўскага райвыканкама Марыя СЕМЯНЮК**, у раёне летась было створана 100 рабочых месцаў. Цяпер у наяўнасці 300 вакансій. Патрабуюцца кіроўцы, трактарысты, станочнікі, прадаўцы.

На перспектыву ёсць задума развіваць вытворчасць больш маштабна. Магчыма, тут будзе пабудавана і свая мэблевая фабрыка. Але развіццё дрэвапераапрацоўкі пойдзе больш дынамічна, калі вакол завода аб'яднаць вытворцаў мэблі, па-дзяржаўнаму разважае Сяргей Асосаў. У Гродзенскай вобласці нямала кампаній, якія маглі б увайсці ў рэгіянальны мэблевы кластар. Гэта можа даць імпульс для стварэння новых прыватных фірмаў і, адпаведна, новых рабочых месцаў.

> «Людзі працавалі пад адкрытым небам, але ішлі да сваёй мэты. Мы стараліся рабіць рэканструкцыю як мага хутчэй, каб прадпрыемства пачало працаваць і людзі адчулі аддачу ад сваёй працы.

— Каля «Мастоўдрэва» павінны развівацца малыя, сярэднія прыватныя прадпрыемствы з далейшай перапрацоўкай, — лічыць генеральны дырэктар, — а мы забяспечым іх фанерай і плітамі. Гэты кірунак — адзін з найбольш эфектыўных спосабаў гаспадарання.

Магчыма, гэта будзе сямейны бізнес, як было раней, і прыкладам таго — стварэнне братамі Канапацкімі завода ў Мастах. Невялікія фабрыкі здольны давесці кожны выраб да бліскучага стану. Масава-паточны спосаб вытворчасці ўжо не так запатрабаваны.

Імпульсам для развіцця падобнага кластара павінен стаць Дэкрэт Прэзідэнта № 7 аб лібералізацыі бізнесу. Дзякуючы яму, знойдуцца тыя, хто зацікавіцца гэтай справай. А выйграюць усе, бо павялічыцца занятасць, загрузяцца пустуючыя плошчы, і, нарэшце, пачнуць вяртацца майстры, якія з'ехалі за мяжу ў пошуках большага заробку.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**


## Извещение о проведении 24 февраля 2020 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 7»

| **Предмет торгов № 1** |
| --- |
| Изолированное помещение с инв. № 600/D-116894 (наименование – изолированное помещение № 1а, площадь – 490,1 кв. м, адрес: Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, 90-1а, район аг. Озерцо); капитальное строение с инв. № 600/С-164078 (наименование – бетонная площадка, площадь – 534,2 кв. м, адрес: Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, район аг. Озерцо); капитальное строение с инв. № 600/С-163929 (наименование – навес металлический, площадь – 76,0 кв. м, адрес: Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, 27/4, район аг. Озерцо) |
| Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, район аг. Озерцо |
| Сведения о земельном участке: кадастровый номер 623688000001001097, площадь – 0,0688 га |
| **Начальная цена: 375 627,40 бел. руб. без учета НДС** |
| Сумма задатка: 37 000,00 бел. руб. |
| **Предмет торгов № 2** |
| Изолированное помещение с инв. № 600/D-51488 (наименование – изолированное помещение в здании склада, площадь – 320,9 кв. м, адрес: Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, район деревни Озерцо (28 км МКАД)); капитальное строение с инв. № 600/С-164081 (наименование – стоянка грузовых автомобилей, площадь – 1442,2 кв. м, адрес: Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, район аг. Озерцо); изолированное помещение с инв. № 600/D-76968 (наименование – изолированное помещение в здании склада, площадь – 318,9 кв. м, адрес: Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, район аг. Озерцо) |
| Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, район аг. Озерцо |
| Сведения о земельном участке: кадастровый номер 623688000001001096, площадь – 0,1510 га |
| **Начальная цена: 558 247,70 бел. руб. без учета НДС** |
| Сумма задатка: 55 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 7», 223021, Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырево, АБК, тел. (017) 507-61-83.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 327-05-62.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 7», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **24 февраля 2020** года в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 24.01.2020 по 20.02.2020** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г.Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 507-61-83 (ОАО «ДСТ № 7»).**

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 18.02.2020 повторного открытого аукциона**

**Лот № 1:** изолированное помещение с инв. № 710/D-84708 – изолированное помещение № 2, площадь – 1556,5 кв. м, назначение: помещение, не относящееся к жилищному фонду, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Станционная, 5-2.
Капитальное строение, в котором находится данное изолированное помещение, расположено на земельном участке с кадастровым номером 741000000006001553. Отдельный земельный участок не выделен.
**Начальная цена продажи: 1 154 400,00 бел. руб. с учетом НДС.**
Сумма задатка: 115 440,00 бел. руб.

**Аукцион состоится 18 февраля 2020 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Подача заявок (осуществляется лично) и внесение задатка: по 17.02.2020 до 15.00, в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты аукциона

**Продавец:** ОАО «Могилевоблавтотранс» УНП 700167884, г. Могилев, ш. Гомельское, 1

**Расчетный счет для внесения задатка:** получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона, включающее в т. ч. затраты на организацию и проведение аукциона, в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата за предмет аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты за предмет аукциона

Извещение о проведении предыдущего аукциона было опубликовано в номере газеты «Звязда» от 12.12.2019

**Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. **Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375222-72-41-14, +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by, на сайте ino.by**



Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Гомельдрев», г. Гомель, ул. Достоевского, 3 |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение: Гомельская обл., Речицкий р-н, Борщевский с/с, д. Александровка**

**Адрес: Гомельская обл., Речицкий р-н, Борщевский с/с, д. 4а, 5, 7, 8, 9.**
**Цех СОУ (арочник),** 340/С-294759, общ. пл. 139,6 кв. м.
**Склад материалов,** 340/С-295182, общ. пл. 13,8 кв. м.
**Склад ГСМ,** 340/С-295183, общ. пл. 36,5 кв. м.
**Овощехранилище,** 340/С-294758, общ. пл. 77,3 кв. м.
**Столовая,** 340/С-290646, общ. пл. 146 кв.м.
**Адрес: Гомельская обл., Речицкий р-н, д. Александровка.**
**Гараж,** 340/С-290647, общ. пл. 792 кв. м.
**Здание конторы,** 340/С-290645, общ. пл. 241,1 кв. м. Составные части и принадлежности: котельная, тамбур, сварочная.
***Имущество, входящее в состав лота:*** **забор металлический** (инв. № 200030), **станок СОУ-1** (инв. № 1782), **транспортер удаления отходов для станка СОУ** (инв. № 6707), **мачта осветительная** (инв. № 6709), **кран-балка с талью** (инв. № 6706)

***Сведения о земельных участках***, предоставленных Продавцу на праве постоянного пользования:
1) общ. пл. **4,6746** га для размещения объектов недвижимости;
2) общ.пл. **2,9808** га для содержания и обслуживания производственной базы;
3) общ. пл. **0,4706** га для обслуживания гаража;
4) общ. пл. **0,2343** га для обслуживания здания конторы.
Ограничения – прибрежная полоса водных объектов, охранные зоны линий электропередачи

**Начальная цена с НДС 20 % – 115 491,96 бел. руб.** (снижена на 50 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **60 (шестидесяти)** рабочих дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от **11.07.2019**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 14.01.2020 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 12.01.2020 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by


# ПАД ПРЫЦЭЛАМ



## Каля вёскі Вусце Аршанскага раёна з'явілася ўнікальная вытворчасць ваенна-абарончай накіраванасці

**На тэрыторыі былой ваеннай базы вырабляюць патроны і мадэрнізуюць авіяцыйныя ракеты, якія адпрацавалі тэрмін і падлягаюць утылізацыі. Сёлета тут плануюць пабудаваць цэхі па вытворчасці нітрацэлюлозы, зборцы бронемашын і супрацьтанкавых кіраваных ракет. Унікальны для краіны праект рэалізуюць спецыялісты «Белзнешспецтэхнікі» і «БСВТ — новыя тэхналогіі».**



Пра тое, што важна не залежаць ад імпарту ўзбраення, кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка казаў яшчэ ў кастрычніку 2018-га, наведваючы палігон Даманава. Дарэчы, раней Беларусь боепрыпасы не выраблялa. Змянілі становішча, каб у гэтым абаронным пытанні мець магчымасць разлічваць на сябе. Спачатку была распрацавана нарматыўна-прававая база, затым падрыхтавалі спецыялістаў, і толькі потым вызначыліся з калібрам — пад пісталет, аўтамат, кулямёт і снайперскую вінтоўку. Наладжаны і пастаўкі прадукцыі ў краіны Заходняй Еўропы і Афрыкі. Па водгуках заказчыкаў, суадносіны «кошт—якасць» — аптымальныя.

— Кожны патрон праходзіць кантроль якасці непасрэдна ў цэху. З партыі ў 10 тысяч робіцца выбарка з 250 гатовых вырабаў, — паведамілі на прадпрыемстве. — Затым правадзіцца праверка ў стралковай лабараторыі, дзе даследуюцца балістыка, фізіка, хімія і гэтак далей.



Для праверкі якасці патронаў пабудаваны цэлы даследчы комплекс, падобных якому ў краіне няма.

Вытворчыя магутнасці аршанскага прадпрыемства хоць адносна і невялікія, але ўсё роўна ўражваюць: тут ёсць магчымасць выпусціць да 30 мільёнаў патронаў у год. А калі попыт будзе, то гэты аб'ём можна павялічыць і пашырыць лінейку іншымі калібрамі.

Рэалізацыя праекта ажыццяўляецца ў рамках Указа № 506 «Аб развіцці Аршанскага раёна», які дазваляе казаць аб далейшым развіцці прадпрыемства. Сёння на «аршанскай пляцоўцы» працуе 150 чалавек, але іх колькасць з улікам планаў па хуткім пашырэнні вытворчасці павялічыцца, магчыма, на такую ж лічбу. Перавага гэтай пляцоўкі ў тым, што тут жывуць спецыялісты, якія шмат гадоў былі задзейнічаны ў захоўванні і абслугоўванні боепрыпасаў. Іх не трэба вучыць, дастаткова толькі перападрыхтоўкі.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

## АДХОДЫ ДРАЎНІНЫ — У КАЦЕЛЬНЮ...

### У «Оршацепластеках» нядаўна запрацавала першая мабільная рубільная машына

З адходаў драўніны яна робіць паліўную дранку для кацельняў, якія працуюць толькі на гэтым відзе паліва. У Аршанскім раёне такія кацельні ёсць у Бабінічах, Андрэеўшчыне, Балбасаве і Высокім.

Рубільная ўстаноўка дазволіць прадпрыемству не толькі павысіць эфектыўнасць саманарыхтоўкі паліва, але і істотна знізіць затраты на вытворчасць цеплавой энергіі.

## ...І КАСТРЫЦУ ТУДЫ Ж!

### Гэтае ж прадпрыемства нядаўна распачало вытворчасць паліўных пялет з кастрыцы льну

«Оршацепласеткі» рэалізавалі ўнікальны для Віцебскай вобласці інвестыцыйны праект. Падобная вытворчасць сёння існуе толькі ў Гродзенскай вобласці. Новая лінія, на якой выпрабляюцца паліўныя гранулы, размясцілася на не выкарыстаных раней плошчах былога завода жалезабетонных вырабаў. Яе прадукцыйнасць — 210 тон пялет у месяц; у год, адпаведна, — больш за 2,5 тысячы тон. У перспектыве кіраўніцтва «Оршацепласетак» плануе арганізаваць работу ўчастка ў дзве змены, а сыравіну будзе закупляць на Арэхаўскім, Дубровенскім і іншых блізкіх да Оршы заводах.




На новай лініі створана пяць высокапрадукцыйных рабочых месцаў. Усяго на КУП «Оршацепласетка» працуе 18 кацельняў на льняных пялетах. Сёлета і ў наступным годзе пачнуць працаваць яшчэ як мінімум тры.

Праект рэалізаваны ў рамках Указа № 506 «Аб развіцці Аршанскага рэгіёна» і дазволіць прадпрыемству забяспечваць кацельні ўласным палівам, знізіць сабекошт выпрацаваньнай цеплаэнергіі, пашырыць пералік прадукцыі, якая выпускаецца. Дарэчы, яе лішкі плануюць рэалізоўваць, у тым ліку пастаўляць на экспарт.

**Па матэрыялах «Аршанскай газеты».**


МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 23 студзеня 2020 года.